


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ВЕРАСНЯ 2021 г. СЕРАДА № 167 (29536)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Агульны ўвод жылля склаў у першым паўгоддзі 2021 года 2040,6 тысячы кв. м, у тым ліку для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, — 866,4 тысячы кв. м, з іх з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 632,5 тысячы кв. м. Для шматдзетных сем'яў уведзена 451,9 тысячы кв. м жылля, індывідуальных жылых дамоў — 908,4 тысячы кв. м, 74,4 тысячы кв. м — арэнднага жылля. Суадносіны кошту будаўніцтва 1 кв. м жылля з дзяржпадтрымкай і намінальнай налічанай сярэднямесячнай зарплаты складаюць 0,81 па выніках паўгоддзя. Таксама галіне ўдалося забяспечыць рэнтабельнасць у 8,5 %, а экспарт тавараў узрос на 22,9 %. У цэлым па выніках года паказчыкі, якія характарызуюць работу комплексу, будуць выкананы».*

# Падарожжа ў чароўную краіну ведаў

***Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, курсантам, выхавальнікам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам***

***Дарагія сябры!***
***Сардэчна віншую вас з Днём ведаў.***

*1 верасня — асаблівая дата ў календары. Усе мы ў першы дзень восені адчуваем душэўны ўздым, успамінаючы свае школьныя і студэнцкія гады — цудоўны час здабыцця мудрых настаўнікаў і сапраўдных сяброў, першых рамантычных перажыванняў, выбару прафесіі і жыццёвага шляху.*

*Больш за ўсіх сёння хвалююцца, вядома ж, першакласнікі і першакурснікі. А таксама бацькі малых, якім толькі трэба адправіцца ў падарожжа ў сапраўды чароўную краіну ведаў.*

*Якой будзе гэтая дарога — залежыць перш за ўсё ад настаўніка. Прафесіяналізм, любоў да дзяцей і актыўная грамадзянская пазіцыя кожнага з вас заслугоўваюць вялікай удзячнасці і павагі, таму што з'яўляюцца моцным падмуркам далейшага дабрабыту Беларусі і адзінства яе народа.*

*У гэты святочны дзень ад усёй душы жадаю ўсім навучэнцам, студэнтам, аспірантам, курсантам, педагогам і бацькам, каб новы вучэбны год стаў калейдаскопам яркіх падзей, а кожны дзень быў напоўнены радасцю і ствараннем.*

*Поспехаў вам!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота БелТА.

Сярэдняя школа № 4 Рэчыцы адкрылася 31 жніўня пасля капітальнага рамонту. Новае аблічча ўстанова набыла напярэдадні свайго 85-годдзя, якое будзе адзначаць у наступным годзе.

**На цырымоніі адкрыцця школы старшакласнікі Цімафей ЯФІМЕНКА і Лізавета ЗМУШКО.**

## КОРАТКА

• У Беларусі з 1 верасня пачнуць выдаваць біяметрычныя дакументы.

**• МНС правядзе 1—10 верасня акцыю «Адзіны дзень бяспекі».**

• Беларускія банкі ў I паўгоддзі больш чым у два разы павялічылі дабрачынную дапамогу.

**• Гомельская вобласць лідзіруе па колькасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, але навучэнцаў больш за ўсё ў Мінску.**

• АДКБ не плануе ўводзіць войскі ў Афганістан.

**• Беларускія школьнікі заваявалі тры медалі на Міжнароднай алімпіядзе па навуках аб Зямлі.**

# Святыні адзінства




**Сёння раніцай ад Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора адпраўляецца ў чарговы шлях міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга.**

Экспедыцыя з'яўляецца часткай Дня беларускага пісьменства і ўжо дваццаць восьмы год напярэдадні гэтага свята праходзіць маршрутам праз многія гарады і вёскі Беларусі. На гэтым шляху адбываюцца незабыўныя сустрэчы з мясцовымі жыхарамі, якім удзельнікі экспедыцыі (святары, навукоўцы, літаратары) расказваюць пра гістарычнае мінулае наведаных мясцін. Вяскоўцы і гараджане таксама выступаюць на гэтых сустрэчах з цікавымі ўспамінамі пра мінулае сваёй малой радзімы, прыгадваюць імёны землякоў з ранейшых пакаленняў.

Як паведаміў кіраўнік экспедыцыі, навуковы супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алесь Лапата-Загорскі, удзельнікі сёлетняй экспедыцыі пабываюць у Баранавіцкім, Ганцавіцкім, Лунінецкім, Салігорскім, Слуцкім, Уздзенскім, Капыльскім раёнах. Ва ўсіх храмах на шляху экспедыцыі адбудуцца богаслужэнні, усе ахвотныя запаляць свае свечкі ад прынесенай лампады з Жыватворным Агнём са Святой Зямлі.

Дарэчы, выгляд гэтай лампады *(на здымку)* сёлета значна змяніўся, яе вырабілі вядомыя мастакі ў маскоўскіх майстэрнях Рускай праваслаўнай царквы. Дастаўлена яна ў Беларусь для экспедыцыі «Дарога да Святыняў».

Як і ў мінулыя гады, газета «Звязда» будзе знаёміць сваіх чытачоў з дзейнасцю экспедыцыі. Глядзіце фотарэпартажы на сайце нашай газеты.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**удзельнік усіх папярэдніх дваццаці сямі экспедыцый.**

З нагоды

# ГРУЗ НАВУКІ

## Як заплечніку «скінуць вагу»?

**Навучальны год пачаўся, і школьнікі, падобныя на юных альпіністаў, адправіліся штурмаваць вяршыні ведаў. Адкуль такое параўнанне? З-за заплечнікаў, якія часам здаюцца большымі за свайго гаспадара. Узваліць на плечы партфель вучня пачатковай і сярэдняй школы (4-6 падручнікаў, сшыткі, пенал, тэлефон або планшэт) і не сагнуцца пад гэтым цяжарам пад сілу далёка не кожнай маме.**

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «Мы захавалі рэпутацыю надзейнага партнёра і цалкам забяспечваем свае функцыі ў плане рэалізацыі транзітнага патэнцыялу»

## Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ далажыў Прэзідэнту Беларусі пра дзейнасць ведамства за 8 месяцаў бягучага года

«Сістэма, якую вы ўзначальваеце, спрацавала сёлета пакуль станоўча, калі меркаваць па лічбах, што вы прадставілі. Дай бог захаваць на працягу гэтага года», — пачаў размову Прэзідэнт.

Па яго словах, ***Беларусь спраўляецца са сваёй транзітнай роляй у міжнароднай эканоміцы, пацвярджаючы сваю рэпутацыю надзейнага партнёра***.

«Транзітны патэнцыял у нас велізарны. Мы цалкам забяспечваем свае функцыі ў плане рэалізацыі транзітнага патэнцыялу», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што, нягледзячы на праблемы, санкцыйны ціск, грузапаток праз Беларусь сёлета павялічыўся на 12 %.

«За восем месяцаў на 100 тысяч грузавікоў больш перасекла граніцу, чым летась», — удакладніў Уладзімір Арлоўскі.

«Думаю, што да канца года можам яшчэ дадаць», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Ён працягнуў: пры росце патокаў асаблівую значнасць набывае добрая прыгранічная інфраструктура, у першую чаргу пункты пропуску.

«Гэта наша інфраструктура пагранічная, якая перадусім адносіцца да мытнага камітэта. Хацелася б, каб вы больш канкрэтна расказалі пра будаўніцтва. Мы хацелі некалькі пунктаў пабудаваць. Як ідуць справы на граніцы з будаўніцтвам гэтых пунктаў пропуску? Гэта важна», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Беларусь актыўна працуе супраць навязаных санкцый, і ў гэтай сувязі ўзрастае роля мытнага камітэта.

«Як мы дапамагаем нашым кампаніям, прадпрыемствам у гэтай сітуацыі? Ціск на граніцы да таго санкцыйнага ціску — будзе ўжо залішне для нашых кампаній. А вось (неабходна. — **«Зв.»**) падтрымаць іх, у тым ліку і ў мытным плане, а магчыма, і ўзгаднўшы з краінамі ЕАЭС (перш за ўсё з Расійскай Федэрацыяй). Магчыма, мы тут знойдзем нешта дадаткова, каб нашы прадпрыемствы, кампаніі адчувалі сябе больш упэўнена ў гэты санкцыйны перыяд», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён пракаментаваў абвінавачванні заходніх палітыкаў у кантрабандзе цыгарэт, стымуляванні нелегальнай міграцыі.

«***Але яны нічога не кажуць, што мы маем ад іх. Асабліва ў плане «наркаты», сінтэтычных наркотыкаў, што паступалі і паступаюць з Еўропы. Гэта замоўчваюць, бо нявыгадна***», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якія яшчэ праблемы існуюць у сферы, ці ёсць пытанні, якія магчыма вырашыць на ўзроўні Прэзідэнта?

«Пытанні, на якія вы хочаце звярнуць увагу, больш падрабязна дакладвайце. Асабліва звярніце ўвагу на тыя даручэнні, якія былі дадзены вам, пагранічнікам у сферы абароны інтарэсаў і эканамічных, і ваенных у Беларусі», — рэзюмаваў кіраўнік краіны.

**• Даведка**

По звестках мытнага камітэта, на канец жніўня ў рэспубліканскі бюджэт паступіла больш за 6,4 мільярда рублёў плацяжоў, кантралюемых ДМК. Пералічаная сума на 25 % большая, чым за такі ж перыяд летась. Адзначаецца рост на 12 % колькасці грузавых транспартных сродкаў, якія перасеклі мытную граніцу. Іх каля 1,6 мільёна. Штодня праз граніцу праязджае каля сямі тысяч грузавых аўто.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• Каментарый у тэму**

**Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ** адзначыў, што Прэзідэнт паставіў мытнікам задачы па напаўненні бюджэту, забеспячэнні транзітнай прыцягальнасці краіны і папярэджанні правапарушэнняў.

«Мытны камітэт — гэта фіскальны орган. Таму ад нас чакаюць выплаты плацяжоў у поўным аб'ёме і выкананне планавых паказчыкаў. За восем месяцаў у нас ідзе перавыкананне на 25 % у параўнанні з мінулым годам. Гэта дадаткова 1,3 мільярда рублёў. Другое — транзітная прыцягальнасць краіны. Тут Прэзідэнтам пастаўлена задача далей развіваць нашу прыгранічную інфраструктуру, скарачаць час мытнага кантролю. Пры гэтым неабходна прадухіляць увоз кантрабанды, папярэджваць эканамічныя правапарушэнні на граніцы і супрацьдзейнічаць самым небяспечным парушэнням — увозу наркотыкаў, зброі, боепрыпасаў», — расказаў старшыня ДМК.

Журналісты адзначылі, што 2020 год з-за пандэміі быў непаказальны ў плане эканамічных параўнанняў. Таму спыталі: вынікі работы мытнікаў такія ж станоўчыя, калі параўноўваць з іншымі гадамі?

«У нас тэндэнцыя станоўчая па плацяжах у параўнанні і з 2019 годам. Беларускія прадпрыемствы працуюць, імпарт, экспарт ідзе, таму і папаўняецца бюджэт», — дадаў Уладзімір Арлоўскі.

Пракаментаваў ён сітуацыю з чэргамі грузавікоў на выезд з Беларусі. Па словах кіраўніка ведамства, асноўная прычына — нерытмічная работа калег з сумежных краін, асабліва па літоўскім кірунку.

«Наша задача — для людзей, якія аказаліся ў такім становішчы (перавозчыкі, кіроўцы), стварыць камфортныя ўмовы. Мы сёлета на самым напружаным кірунку Каменны Лог — Мядзінінкай (гэта прамая дарога на Вільнюс) стварылі пляцоўку электроннай чаргі. Вадзіцелі могуць там адпачываць, чакаць сваёй чаргі праходжання граніцы. Тым больш у пункце пропуску Мядзінінкай на літоўскім баку ідзе рэканструкцыя. Прапускная здольнасць у два разы знізілася», — паведаміў Уладзімір Арлоўскі.

Як адзначыў старшыня мытнага камітэта, асноўная дапамога ведамства дзяржаўным прадпрыемствам — вялікая хуткасць афармлення дакументаў і прыняцця рашэнняў.

«Мы ўкараняем такія механізмы, якія выключаць чаканне суб'ектам гаспадарання афармлення яго дэкларацыі. Наш асноўны праект сёлета — цэнтр электроннага дэкларавання. Ён дазваляе незалежна ад таго, дзе знаходзіцца прадпрыемства, накіроўваць сваю дэкларацыю праз інтэрнэт у мытную сістэму. Яна афармляецца не там, дзе знаходзіцца тавар, а дзе інспектар менш загружаны. Такім чынам перыяд чакання практычна сыходзіць», — удакладняе суразмоўнік.

Ён дадаў, што 85 % экспарту афармляюцца супрацоўнікамі на працягу пяці хвілін, палова імпарту — на працягу гадзіны. Увогуле, 32 % усіх тавараў афармляюцца аўтаматычна.

Дадзены Прэзідэнтам, па словах старшыні ДМК, задачы і па праваахоўнай дзейнасці.

«Задача ў гэтым кірунку — паставіць жорсткі заслон правапарушэнням. Кантрабанда — найбольш праблемны від парушэнняў, якія нясуць вялікую шкоду. Намі ўжо выключаны пры перамяшчэнні праз граніцу 433 кілаграмы наркотыкаў. Гэта ў пяць разоў больш, чым летась. Прычым выяўленні ёсць амаль кожны дзень. Ідзе пераарыентацыя кантрабанды з-за таго, што рух легкавых аўтамабіляў невялікі, менш фізічных асоб перасякае граніцу. Таму кантрабанда пераарыентаваная на ўвоз у грузавіках», — паведаміў Уладзімір Арлоўскі.

Паводле яго слоў, на першым плане ў мытных органаў таксама прадухіленне незаконнага ўвозу валюты, зброі і боепрыпасаў.

# Зрабіць высновы і намеціць планы на будучыню

**Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктарам Лукашэнкам, перадае карэспандэнт БелТА.**

Былі абмеркаваны вынікі Алімпіяды, якая прайшла ў Токіа, выступленне на ёй беларускіх атлетаў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што цяпер важна зрабіць неабходныя высновы і намеціць крокі на будучыню, вызначыць, як выбудоўваць работу спартыўнай галіны для дасягнення максімальнага выніку. Як і раней, акрамя кіраўніцтва НАК, адказнасць за гэта ляжыць на профільных міністры і віцэ-прэм'еры.

Аляксандр Лукашэнка асабліва акцэнтаваў увагу на важнасці падбору і выяўлення перспектыўных спартсменаў, пачынаючы з ранняга ўзросту. Калі планамерна і прадметна гэтым не займацца, то пасля не прыйдзецца разлічваць на высокія дасягненні, падкрэсліў Прэзідэнт.

У цэнтры ўвагі

# Супрацоўніцтва ў інтарэсах грамадства

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла рабочую сустрэчу з Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веніямінам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, аб гэтым паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што сённяшняя сустрэча прадыктавана часам.

— На нядаўнім выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі, якое прайшло ў духоўна-асветніцкім цэнтры полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, мы абмяркоўвалі падыходы і праграму далейшых сумесных намаганняў у дзейнасці сістэмы, якая дазваляе эфектыўна ўплываць на негатыўныя працэсы, звязаныя з п'янствам і алкагалізмам. Надышоў час падвесці пэўныя вынікі сумеснай дзейнасці, — падкрэсліла яна.

Старшыня Савета Рэспублікі і Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі абмеркавалі таксама пытанні духоўна-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення і моладзі, супрацоўніцтва дзяржавы і царквы ды іншыя.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Слова дэпутата

# ГАЛОЎНАЕ — ВЫХАВАЦЬ ПАТРЫЁТА



***Людміла ЗДОРЫКАВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:***

— Як былога настаўніка, мяне прыемна хвалюе наша прыгожае восеньскае свята пад назвай Дзень ведаў. Я таксама бяру ўдзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных яму, з вялікай радасцю далучаюся да ўсенароднай акцыі «Збяром партфель разам».

Мае словы падзякі педагогам, якія сваёй працай, адданасцю абранай аднойчы справе вучаць дзяцей дабрыні, любові да Радзімы, самым светлым і чалавечым якасцям, паказваюць сваім прыкладам, што такое сапраўдны патрыёт, вучаць прааўляць яго ў сабе. Вельмі хвалююся за першакласнікаў, якія робяць свае першыя крокі ў цудоўным свеце ведаў. Хочацца, каб першы ўрок іх быў незабыўны, каб яны прыйшлі на яго як на свята і захавалі гэтае адчуванне як мага даўжэй. Гэты год будзе вельмі важны для выпускнікоў. Спадзяюся, што шмат хто з іх вызначыўся са сваімі найбліжэйшымі перспектывамі на жыццё. Няхай іх планы здзейсняцца!

Вялікі дзякуй бацькам за разуменне, за падтрымку. Яны нашы паплечнікі ў нялёгкай рабоце выхавання. Прайшлі педагагічныя саветы, на ўсіх іх прысутнічалі кіраўнікі абласцей, прадстаўнікі выканаўчай улады.

Адзначу, што вялікая дапамога аказана дзяржавай у падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года, ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Сёлета размова ішла пра стварэнне камфортных і бяспечных умоў ва ўстановах адукацыі. Работа зроблена вялікая і спадзяюся, што школы стануць на новы ўзровень свайго развіцця. І тая галоўная задача, якая пастаўлена перад педагогамі, — выхаванне ў першую чаргу патрыёта, як ніколі важная. Кожны чалавек павінен любіць сваю Радзіму, край, дзе ён вырас, прыкладаць намаганні, каб наша краіна квітнела і развівалася, каб ёй ганарыліся нашчадкі.

І новы прадмет, які ўводзіцца факультатыўна, накіраваны на тое, каб выхоўваць у падлетках духоўнасць. Чалавек павінен кіравацца ў жыцці прынцыпамі добрасардэчнасці, павагі да іншых. На жаль, бацькам у штодзённым жыцці часта не хапае часу пагутарыць са сваімі дзецьмі пра высокія каштоўнасці. Часцей за ўсё яны абмяжоўваюцца надзённымі праблемамі — што паеў, якія адзнакі атрымаў. Магчыма, некаторыя бацькі і не ўмеюць размаўляць на духоўныя тэмы або не лічаць гэта неабходным. Таму калі ў школе гэтаму будзе ўдзяляцца нейкі час, лічу, гэта толькі на карысць дзіцяці, бо робіцца гэта ў мэтах выхавання гарманічнай асобы. Чым больш мы будзем размаўляць з дзецьмі пра дабро, тым хутчэй яно будзе ўкараняцца ў гэтыя яшчэ мяккія, як губка, успрымальныя душы. Потым, калі яны па-даросламу ачарсцвеюць, цяжка будзе прабіцца ў іх дабрыні і сардэчнасці. Гэты факультатыў — добры дадатак да той выхаваўчай работы, якая праводзіцца ў школе. Бо выхаванне высокамаральнай і духоўнай асобы — адзін з галоўных кірункаў. Факультатыў стане яшчэ адным важным звяном у гэтым ланцужку.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Якасць жыцця

# АТАМНАЯ СТАНЦЫЯ «ПАБУДАВАЛА» АСТРАВЕЦ

**Менавіта так успрымаюць рэалізацыю найбуйнейшага ў рамках Саюзнай дзяржавы энергетычнага праекта — будаўніцтва БелАЭС — мясцовыя жыхары і ўлады. Генеральны падрадчык праекта Дзяржкарпарацыя «Расатам» бярэ актыўны ўдзел не толькі ва ўзвядзенні станцыі, але і ва ўсіх сферах жыцця горада, раёна і Гродзенскай вобласці.**

Так, рэалізоўваюцца новыя адукацыйныя праграмы ў садках і школах, створаны «атамны» клас. Летась «Расатам» падарыў Астраўцу ПЛР-лабараторыю, дзякуючы чаму вынікі тэстаў на COVID-19 можна атрымаць праз некалькі гадзін, а сёлета — зладзіў свята з нагоды дня нараджэння горада.

— Цяперашні Астравец — квітнеючы, утульны і камфортны горад. Спецыялісты-атамшчыкі і іх сем'і — аснова насельніцтва. Услед за імі ў Астравец пацягнуліся ўрачы, настаўнікі, будаўнікі, прадаўцы, медыкі, — падкрэсліў значнасць будаўніцтва БелАЭС для развіцця горада **старшыня Астравецкага райвыканкама Ігар ШАЛУДЗІН.** — Пры гэтым горад не проста прырастае насельніцтвам, але і комплексна развіваецца. Будуюцца і мадэрнізуюцца жылыя кварталы, сацыяльныя і культурныя аб'екты, стадыёны і спарткомплексы. Каб паміж імі было зручна перамяшчацца, пракладзены дзясяткі кіламетраў дарог. З'явіліся новыя крамы, кафэ, актыўна развіваецца турыстычная індустрыя.

За час работы над стварэннем атамнай станцыі ў Астраўцы з'явілася каля 2,5 тысячы рабочых месцаў. Тутэйшая новая бальніца стала шматфункцыянальным міжрэгіянальным медцэнтрам, у якім ёсць аддзяленні прамянёвай дыягностыкі з камп'ютарным і магнітна-рэзанансным тамографамі, рэнтгенаэндаваскулярнай хірургіі і кардыялогіі. Пабудаваны тры новыя мікрараёны з больш як чатырма тысячамі кватэр агульнай плошчай 315 тысяч м$^2$.

— Актыўны ўдзел у паляпшэнні якасці жыцця рэгіёнаў — адзін з галоўных прынцыпаў нашай дзейнасці, — расказаў **Віктар БРЫЧ, намеснік дырэктара па агульных пытаннях прадстаўніцтва АТ «АБЭ» ў Беларусі.** — Удзельнікі будаўніцтва БелАЭС лічаць Астравец сваім домам, і гэта найбольш яскравае пацвярджэнне сяброўскіх адносін з мясцовымі жыхарамі і ўладамі. Удзел атамшчыкаў у гарадскіх святах стаў традыцыяй, а нашы навукова-забаўляльныя праграмы карыстаюцца папулярнасцю ў малечы і дарослых.

За гады работы над будаўніцтвам БелАЭС з дапамогай расійскай атамнай кампаніі ў рэгіёне рэалізавана 136 праектаў сацыяльнай накіраванасці.



**Ірына СІДАРОК.**
**Фота дадзена Дзяржкарпарацыяй «Расатам».**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША завяршылі вывад войскаў з Афганістана



**Злучаныя Штаты Амерыкі вывелі свае войскі з Афганістана і завяршылі як аперацыю па эвакуацыі грамадзянскіх асоб з Кабула, так і ўсю сваю ваенную місію ў гэтай краіне, распачатую неўзабаве пасля тэрактаў 11 верасня 2001 года. Пра гэта заявіў на брыфінгу ў Пентагоне кіраўнік Цэнтральнага камандавання Узброеных Сіл ЗША генерал Кенет Макензі, паведамляе ТАСС.**

«Я сёння тут, каб абвясціць аб завяршэнні вываду нашых войскаў з Афганістана і заканчэнні ваеннай аперацыі па эвакуацыі амерыканскіх грамадзян, грамадзян іншых краін, а таксама афганцаў, якія знаходзіліся ва ўразлівым становішчы», — сказаў Кенет Макензі.

«Апошні ваенна-транспартны самалёт вылецеў з міжнароднага аэрапорта імя Хаміда Карзая 30 жніўня, на яго борце знаходзіўся часовы павераны ў справах ЗША ў Афганістане Рос Уілсан.

Прадстаўнік катарскага палітычнага офіса руху «Талібан» Махамад Сахаіл Шахін пацвердзіў на сваёй старонцы ў Twitter, што апошні прадстаўнік Узброеных Сіл ЗША пакінуў тэрыторыю Афганістана. «Сёння ноччу ў 00:00 па афганскім часе апошні амерыканскі салдат пакінуў Афганістан», — адзначыў прадстаўнік «Талібана».

### У Страсбургу асуджаюць дзеянні Латвіі і Літвы ў адносінах да мігрантаў

**Як паведамляе BBC, замест таго каб прымаць мігрантаў і разглядаць іх прашэнні аб прытулку, Латвія і Літва заварочваюць іх на граніцы і адпраўляюць назад. Такія дзеянні ўступаюць у супярэчнасць з еўрапейскім заканадаўствам.**

Міністэрства ўнутраных спраў Літвы паведаміла, што мігрантаў будуць заварочваць непасрэдна на граніцы замест таго, каб затрымліваць і адпраўляць у месцы расялення. «Асоб, якія наўмысна будуць спрабаваць перасякаць граніцу ў забароненых месцах, трэба расцэньваць як грамадзян, якія маюць намер ажыццявіць злачынную дзейнасць — незаконны пераход дзяржаўнай граніцы», — цытуе МУС літоўскі грамадскі вяшчальнік LRT.

У суседняй Латвіі ў пагранічнай зоне быў абвешчаны рэжым надзвычайнага становішча. Урад абавязаў пагранічнікаў высылаць мігрантаў сілай, а прыняцце прашэнняў аб статусе бежанца ў прыгранічных раёнах было прыпынена.

Па словах саветніка фракцыі «зялёных» у Еўрапарламенце Аляксея Дзімітрава, як Латвія, так і Літва парушаюць адразу некалькі міжнародных заканадаўчых актаў. «Латвія парушае больш, — сказаў ён. — Таму што Латвія не толькі заварочвае людзей на граніцы, але і забараняе ім падаваць прашэнні аб прытулку на тэрыторыі, прылеглай да граніцы. У Літве такой забароны няма».



Другая частка шостага параграфа еўрапейскай дырэктывы аб даванні прытулку гаворыць, што кожная краіна ЕС абавязана даць чалавеку магчымасць падаць прашэнне аб статусе бежанца. Гэта можна інтэрпрэтаваць паводле таго, што канкрэтна лічыць прашэннем, бо ў мігрантаў на граніцы няма з сабой запоўненага бланка з просьбай даць прытулак. Паводле слоў Дзімітрава, гэта не падстава адпраўляць чалавека назад, таму што кожная краіна ЕС абавязана даць мігранту магчымасць падрыхтаваць такое прашэнне.

У дырэктыве таксама ёсць пункт, згодна з якім краіна ЕС можа правесці паскораную працэдуру ацэнкі проста на граніцы. Пераважная большасць мігрантаў прыбывае ў балтыйскія краіны без дакументаў, гэта значыць іх можна было б завярнуць на граніцы, правёўшы паскораную праверку. Аднак гэтага не адбываецца: ні Латвія, ні Літва не праводзяць наогул ніякіх праверак, нават паскораных.

Адзначаецца таксама цяжкае становішча мігрантаў, якія знаходзяцца ў пагранічнай зоне. Некаторыя з іх жывуць без ежы, вады і даху над галавой. Чвэрць мігрантаў — непаўналетнія.

«У цяперашняй вельмі палітызаванай сітуацыі з міграцыяй асабліва важна, каб дзяржавы Еўропы рэагавалі рашуча і прынцыпова, гарантуючы, што правы людзей, якія прыбываюць, не становяцца другараднымі ў адносінах да геапалітычных меркаванняў», — цытуе латвійскі грамадскі вяшчальнік камісара Савета Еўропы па правах чалавека Дуню Міятавіч.

Алімпійскі дзённік

# Аляксей Талай устанавіў новы рэкорд Параалімпійскіх гульняў

**У алімпійскім «Аквацік цэнтры» ў Токіа працягваюцца спаборніцтвы па параалімпійскім плаванні. У апошні дзень лета на дыстанцыі 50 метраў брасам у класе SB2 тут выступаў Аляксей Талай. І няхай на п'едэстал параалімпіец на падняўся, нагода для гонару ёсць.**



У папярэдніх заплывах Аляксей паказаў вынік у 1 хв. 24.86 секунды. Гэты час дазволіў яму не проста кваліфікавацца ў фінал спаборніцтваў, але і ўстанавіць новы рэкорд Параалімпійскіх гульняў у сваім класе, які трымаўся з 1992 года.

У фінальным заплыве Аляксей Талай палепшыў свой уласны вынік, паказаны раней. У фінале ён прыплыў да фінішу за 1 хв. 23.16 секунды. Гэтага часу не хапіла для заваявання медаля, у выніковым пратаколе беларус размясціўся на 7-й пазіцыі. Але такім чынам за адзін дзень Аляксей Талай двойчы перапісаў 29-гадовы рэкорд Параалімпіяды ў класе SB1.

«Я ўстанавіў два параалімпійскія рэкорды тут, у Токіа. Дзякуй за вашу падтрымку. Мы гэта зрабілі. Люблю вас», — звярнуўся да аматараў Аляксей на сваёй старонцы ў «Інстаграм».

Наперадзе Аляксея чакае яшчэ адзін параалімпійскі заплыў — на 50 метраў на спіне. Працягваюць свае выступленне ў Токіа беларускія лёгкаатлеты і плыўцы. У чацвер на старт выйдзе адзіны прадстаўнік Беларусі ў параканоэ Ілья Таўпянец. Параалімпійскія гульні ў Токіа завершацца 5 верасня.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Прыемная навіна

# ПАДАРУНАК ФІЛАТЭЛІСТАМ

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі 8 верасня выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Архітэктура Беларусі. Праваслаўныя храмы».**




Дызайн паштовага блока Алены Мядзведзь. Мастак маркі — Таццяна Дольская.

«На марцы намаляваны Аляксандра-Неўскі храм, асвячоны больш за 120 гадоў таму. Ён з'яўляецца адным з нямногіх архітэктурных аб'ектаў сталіцы, які захаваўся да нашых дзён практычна ў першапачатковым выглядзе. Пабудаваны на Ваенных могілках горада Мінска ў 1898 годзе ў гонар перамогі рускіх войск у Руска-турэцкай вайне 1877—1878 гадоў. Гэты праект быў падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з прыходам Аляксандра-Неўскага храма ў Мінску», — гаворыцца ў паведамленні «Белпошты».

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

# ГРУЗ НАВУКІ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Тата, вядома, здужае. Але, калі, дапусцім, у заплечнік трэба ўцiснуць яшчэ і фізкультурную форму... Плюс зменны абутак (а нярэдка яшчэ і абутак для фізкультуры), атласы і контурныя карты (ці, дапусцім, кнігу для пазакласнага чытання), плюс сёе-тое на перакус... Напэўна, і тату школьны партфель дзіцяці не падасца лёгкім.

Якая вага школьнага заплечніка бяспечная для дзіцяці? Маса штодзённага камплекта падручнікаў з пісьмовымі прыладамі (без масы ранца ці заплечніка) павінна складаць не больш за 1,5 кг для навучэнцаў 1-2 класаў, 2 кг для навучэнцаў 3-4 класаў, 2,5 кг для навучэнцаў 5-6 класаў, 3 кг для навучэнцаў 7-8 класаў і 3,5 кг для навучэнцаў 9-11 класаў, распавялі ў аддзяленні гігіены дзяцей і падлеткаў ДУ «Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна г. Мінска». Нарміруецца таксама вага ранцаў, заплечнікаў і вучнёўскіх партфеляў. Для вучняў пачатковых класаў яна павінна быць не большая за 600—700 грамаў, для навучэнцаў сярэдніх і старэйшых класаў — не большая за кілаграм.

**Марына, мама чацвёртакласніка і сямікласніцы:**

*— На жаль, нормы вагі школьнага партфеля наўрад ці ўдасца вытрымліваць. Сын пайшоў у чацвёрты клас, і ў нас адна англійская мова «цягне» кілаграма на паўтара! Перад гэтым навучальным годам прыйшлося доўга думаць, які аб'ём заплечніка купляць, каб усё ў яго змясцілася. Лічыцца, што чацвёртакласнікі ўжо вялікія — ні падручнікі, ні альбом і фарбы, ні фізкультурную форму ў школе пакідаць не дазваляецца. Вось уявіце: у дзіцяці шэсць урокаў, адзін з якіх — фізкультура. Значыць, плюс падручнікаў, сшыткі, пенал, фізкультурная форма, зменны абутак... Ды яшчэ сам па сабе заплечнік нешта важыць. А сын важыць 34 кілаграмы! У сёмым класе партфель яшчэ цяжэйшы.*

— Цяжкі школьны ранец можа стаць прычынай пастаяннай стомленасці, боляў у мышцах і пазваночніку, скаліёзу і сутуласці, — адзначае **валеолаг 27-й гарадской паліклінікі Лілія КАЦЭР.** — Таму перш за ўсё трэба паклапаціцца аб добрым артапедычным заплечніку для школьніка, які правільна і бяспечна размяркоўвае нагрузку на апорна-рухальны апарат. Дзіця, надзяваючы ранец, не павінна нахіляцца наперад або назад.

**Тацццяна, маці другакласніка:**

*— Пытанне са школьным заплечнікам — вельмі няпростае. Бо гэта дадатковая вага. Медыкі раяць артапедычны, каб спіна была роўная. Але калі звычайны заплечнік важыць 450—500 г, то з артапедычнымі ўстаўкамі — каля 800. Вось і атрымліваецца: або роўная спіна, або дадатковая вага на спіне дзіцяці...*

**Медыкі прапануюць вылучыць у школах дадатковыя месцы (шафкі, паліцы), каб дзіця магло пакідаць там набор фарбаў, альбом, фізкультурную форму і г. д.**

## КАЛІ ВЕЛЬМІ ЦЯЖКА...

Існуюць рэальныя рызыкі для здароўя школьніка, звязаныя з занадта цяжкім ранцам, кажуць спецыялісты.

— Кароткатэрміновыя пабочныя эфекты рэгулярнага нашэння занадта цяжкага заплечніка дзецьмі і падлеткамі ўключаюць боль у спіне, шыі, плячах, здранцвенне і слабасць у руках, — адзначае валеолаг Лілія Кацэр. — Але ёсць і доўгатэрміновыя пабочныя эфекты. Нагрузка на шыю і плечы прыводзіць да галаўных боляў, пашкоджанне пазваночніка — да такіх праблем, як сутуласць і скаліёз. Цяжкія заплечнікі школьнікаў правакуюць недастатковы прыток крыві да канечнасцяў, яны — віноўнікі боляў у шыі і пояснiцы, а скажоная асанка зніжае дыхальную здольнасць з-за ціску на лёгкія. Залішняя вага заплечніка становіцца прычынай анамальнага росту костак у дзіцяці. Менавіта таму бацькам і настаўнікам вельмі важна кантраляваць вагу заплечнікаў школьнікаў.

— Нашэнне партфеля, які перавышае дапушчальныя нормы па масе, уплывае на пазваночнік і ўнутраныя органы, — падкрэслівае **в. а. загадчыка аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна г. Мінска Паліна РАМАНАВА.** — Гэта можа прывесці да ўзнікнення боляў у спіне, парушэнняў паставы і хады. Цяжкі заплечнік павышае небяспеку траўмаў. Акрамя таго, дзіця фізічна стамляецца, а стомленасць дрэнна адбіваецца на працаздольнасці.

## ГЭЙ, ЛЯГЧЭЙ!

Кантраляваць вагу школьнага партфеля павінны бацькі і настаўнікі, падкрэсліваюць спецыялісты. Але што можна зрабіць?

— Дзецям сапраўды даводзіцца насіць вельмі цяжкія ранцы, — кажа настаўнік ліцэя Галіна Грынчук. — Як зрабіць іх лягчэйшым? Напрыклад, у класах можа быць другі камплект падручнікаў — іх купляюць бацькі, і дзеці могуць не насіць кнігі ў школу. У нас у пачатковай школе гэта так. Але падобная сістэма цалкам прымальная і для старэйшых класаў, дзе дзеці ходзяць з кабінета ў кабінет. Чаму б, дапусцім, у кабінеце фізікі не мець камплект з трыццаці падручнікаў для 7, 8, 9 класаў і г. д., якія можна раздаваць у пачатку ўрока? І гэтак жа — у іншых кабінетах. Усё гэта вырашальна — на ўзроўні бацькоў, класнага кіраўніка, адміністрацыі школы. Настаўнік, вядома, павінен сачыць, каб гэтыя падручнікі дзеці выпадкова не заносілі дадому, каб ставіліся да іх акуратна. Але ўсё гэта цалкам рэальна. У нас дзеці пакідаюць у школе фізкультурную форму — гэта таксама вырашаецца на ўзроўні навучальнай установы.

Са свайго боку медыкі прапануюць вылучыць у школах дадатковыя месцы (шафкі, паліцы), каб дзіця магло пакідаць там набор фарбаў, альбом, фізкультурную форму, адзначае Лілія Кацэр.

Акрамя таго, кажучы аб «пераважцы», медыкі і настаўнікі маюць на ўвазе школьныя прылады і рэчы, неабходныя для вучобы. Між тым, у агульнай вазе варта ўлічыць таксама неабавязковыя для навучання прадметы. У малодшых класах і ў пачатку сярэдняй школы гэта могуць быць цацкі, у 8-9 класе — гаджэты, а ў дзяўчынак — яшчэ і касметыка.

**Юлія, мама двух старшакласнікаў (сын — 10 клас, дачка — 11 клас):**

*— Класа з дзявятага пытанне цяжкага школьнага ранца становіцца не такое актуальнае. Частку падручнікаў можна адкрываць на планшэце — у нашай школе, напрыклад, гэта дазваляюць. Да дзясятага класа дзеці становяцца дарослымі і самі выкладваюць з заплечнікаў лішняе. Але раней даводзілася сачыць за тым, што і ў якой колькасці сын і дачка кладуць у школьны заплечнік, каб у партфелях не было лішняга. Да таго ж, часам дзеці забываюць вылажыць падручнік ці спартыўную форму, якія на наступны дзень непатрэбныя. Так што мая парада бацькам малодшых школьнікаў: праводзьце раз на некалькі дзён «рэвізію» змесціва партфеля ваша дзіцяці — так вы зможаце рэгулярна вызваляць яго ад непатрэбных у школе рэчаў.*

І яшчэ некалькі парад ад бацькоў школьнікаў:

- Сёння магчыма спампаваць падручнікі ў электронным выглядзе на планшэт. Гэты варыянт непрымальны для малодшай школы, але падыдзе падлеткам. Калі ў вашай школе гэта дазволена школьнай адміністрацыяй і ў вас ёсць планшэт — такі спосаб карыстання падручнікамі дазволіць партфелю вельмі сур'ёзна «скінуць вагу».
- Можна проста дамовіцца з суседам па парце аб тым, каб насіць падручнікі напалам — партфель, адпаведна, таксама «схудnee» напалову.
- Калі насіць падручнікі ўсё ж прыйдзецца, трохі зменшыць вагу партфеля можна за кошт пенала. Гэты прадмет здольны сур'ёзна дадаць вагі заплечніку. Хай у пенале будзе толькі тое, што сапраўды неабходна. І сам пенал лепш выбраць лёгкі па вазе.
- Тое ж самае датычыцца ланчбокса (ён павінен быць з лёгкага матэрыялу) і парасоніка або дажджавіка: выбіраем максімальна лёгкія па вазе варыянты. Для зменнага абутку гэта таксама актуальна.

## ЗБІРАЕМ РАНЕЦ ПРАВІЛЬНА

Значэнне мае не толькі вага школьнага ранца, але і тое, як у яго пакладзены школьныя прылады і як яго носяць дзіця.

— Дзеці і падлеткі, якія носяць заплечнікі, спусціўшы шлейкі, так, каб ён дакранаўся да ніжняй часткі спіны, або вешаюць заплечнік толькі на адно плячо, падвяргаюць сваю спіну больш моцным і нераўнамерным нагрузкам, чым тыя, хто носяць заплечнік правільна. Аптымальнае нашэнне заплечніка ў верхняй частцы спіны, з фіксацыяй шырокімі шлейкамі на абодвух плячах, — падкрэслівае Паліна Раманава.

Акрамя таго, адзначаюць медыкі, бацькі павінны навучыць дзяцей правільна збіраць школьны заплечнік, партфель ці ранец.

- ✓ Найбольш цяжкія прадметы (падручнікі і кнігі) павінны змяшчацца бліжэй да спіны. Калі яны далёка ад спінкі заплечніка, то іх вага адцягвае пазваночнік, што негатыўна ўплывае на паставу і можа стаць прычынай траўмаў пазваночніка.
- ✓ Важна, каб усе аддзяленні і кішэні заплечніка выкарыстоўваліся — так вага будзе размяркоўвацца раўнамерна і заплечнік па адчуваннях стане не такі цяжкі.
- ✓ Для напаўнення бакавых кішэняў лепш выкарыстоўваць больш лёгкія рэчы. Цяжкія прадметы ў бакавых кішэнях заплечніка будуць «перацягваць» вагу, і гэта можа дэфармаваць або траўмаваць пазваночнік дзіцяці.

І не забываемся пра святлоадбівальныя элементы на школьнай сумцы, партфелі або заплечніку — на пярэдніх, бакавых паверхнях і верхнім клапане. Гэта, вядома, ніяк не звязана з вагой школьнай сумкі, але таксама надзвычай важна!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

Анонс

# «РАЗАМ МЫ ЗМОЖАМ БОЛЬШ»

## Пад такой назвай 2 верасня ў Магілёве пройдзе фестываль творчасці інвалідаў

**У ім прымуць удзел калектывы мастацкай творчасці і індывідуальныя выканаўцы з ліку людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі з Магілёва, Бабруйска, Магілёўскага, Клічаўскага, Дрыбінскага, Бабруйскага, Горацкага, Слаўгарадскага, Крычаўскага і Глускага раёнаў.**

Яны будуць дэманстраваць свае таленты ў канцэртнай зале Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы. Там жа адбудуцца выстаўкі дэкаратыўна-прыкладных работ удзельнікаў ад магілёўскіх арганізацый грамадскіх аб'яднанняў «Беларускае таварыства глухіх» і «Беларускае таварыства інвалідаў».

«Фестываль праводзіцца з мэтай фарміравання спрыяльных умоў для развіцця творчага патэнцыялу асаблівых людзей, выканання культуралагічнай, аздараўленчай і адукацыйнай функцый, абмену вопытам, для сацыяльнай адаптацыі сродкамі мастацтва, а таксама для выяўлення і падтрымкі творча адораных, яркіх і таленавітых імёнаў і калектываў, удасканалення выканальніцкай культуры і сцэнічнага майстэрства, — паведамілі ў Магілёўскім аблвыканкаме.

У рамках фестывалю прадугледжаны конкурсныя выступленні калектываў і індывідуальных выканаўцаў у намінацыях «Арыгінальны жанр», «Мастацкае слова», «Жэставыя спевы», «Эстрадныя спевы», «Народныя спевы», «Аўтарская паэзія і бардаўская творчасць», «Харэаграфічнае мастацтва». Адбудзецца таксама конкурсны прагляд прадметаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і твораў выяўленчага мастацтва людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Фестываль завершыцца гала-канцэртам і цырымоніяй узнагароджання пераможцаў і ўдзельнікаў конкурсу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

---

Акцыя

# «ДАСТУПНАЕ ПРАВА»

## Студэнтам у гэты дзень — бясплатна

**Бясплатныя юрыдычныя кансультацыі змогуць атрымаць 1 верасня з 12.00 да 15.00 студэнты сталічных ВНУ. Акцыя «Даступнае права» пройдзе ў Дзень ведаў у бібліятэцы юрыдычнага факультэта БДУ (вул. Ленінградская, 8). Першакурснікаў, якія сёлета сталі студэнтамі (а іх 21 тысяча), а таксама тых, хто ўжо вучыцца ў ВНУ, чакаюць спецыялісты Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў, Беларускай натарыяльнай палаты і Міністэрства юстыцыі.**

Студэнты змогуць даведацца пра ўмовы сацыяльнай падтрымкі навучэнцаў і знайсці адказы на пытанні, што датычацца працоўнага, грамадзянскага і жыллёвага права. Юрысты, натарыусы і адвакаты таксама патлумачаць ахвотнікам, якім чынам здзяйсняюцца натарыяльныя дзеянні, што рабіць, каб спагнаць доўг з неплацельшчыка, і як зарэгістраваць свой бізнес.

— Акцыі па бясплатных прававых кансультацыях Міністэрства юстыцыі ладзіць традыцыйна. Аднак сёлета ўпершыню іх арганізавалі для студэнтаў, — падкрэсліла **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Мінюста.**

Тыя, хто 1 верасня ў згаданы час не змогуць звярнуцца да спецыялістаў, пазней атрымаюць анлайн-кансультацыю, калі дашлюць свае пытанне на электронны адрас юрыдычнай клінікі БДУ: klinikabsu@mail.ru.

**Ірына СІДАРОК.**

# ЯК ЗНЯЦЬ ЖЫЛЛЁ БЯСПЕЧНА ДЛЯ КАШАЛЬКА?

## Самастойна ці з дапамогай агенцтва нерухомасці

**Пачатак навучальнага года заўжды выклікае павышаны попыт на здымнае жыллё і актывізацыю агентаў нерухомасці, сярод якіх сустракаюцца і нядобрасумленныя. Што рабіць, калі ты трапіў на іх па рэкламе? Калі неабходна заключаць дагавор, а калі — не? Чым кіравацца пры пошуку жылля ўвогуле? Разабрацца ў хітраспляценнях заканадаўства па рыэлтарскай дзейнасці карэспандэнту «Звязды» дапамагала Таццяна БУЛАХ, кансультант упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі.**



### Знайшоў жыллё сам — агенцтву нічога не вінен

Шукаць жыллё можна двума спосабамі: самастойна і з дапамогай агенцтваў. Каб не патраціць грошы і ў выніку не знайсці ніводнага варыянта, трэба дакладна ўсведамляць нюансы магчымых узаемаадносін з агенцтвам. **Ад таго, звярнуўся чалавек у агенцтва, трапіўшы на рэкламу, ці знарок прыйшоў, каб атрымаць дапамогу ў пошуку жылля, залежыць неабходнасць і заключэння дагавора, і аплаты паслуг.**

*— Напрыклад, вы ў пошуках жылля маніторылі рэкламу і знайшлі нерухомасць для здымання, якую прапануе агенцтва. У гэтым выпадку агенцтва ўжо павінна мець дагавор з уласнікам рэкламаванай кватэры і выконваць свае абавязацельствы па пошуку яму наймальніка. Гэта значыць, што паслугі заказаў і аплаціў уласнік прапанаванай нерухомасці. Чалавек, які зацікавіўся такой кватэрай і звярнуўся ў агенцтва, што яе рэкламуе, не павінен заключаць з гэтай арганізацыяй дагавор і тым больш за нешта плаціць. Тлумачэнні агентаў, што рэкламаваная кватэра сапраўды прапануецца да здымання, але каб яе паглядзець, трэба заключыць дагавор і аплаціць паслугі агенцтва, — незаконныя,* — растлумачыла Таццяна Булах.

### Аплата адрасоў

Калі на самастойны пошук падыходзячага варыянта няма часу, і чалавек звяртаецца да пасрэдніка (агенцтва), які зробіць справу за яго, то дагавор заключаць трэба.

*— Дагавор павінен быць складзены пісьмова ў двух экзэмплярах, адзін з якіх выдаецца на рукі спажыўцу паслуг агенцтва. Далей усё залежыць ад таго, якія паслугі заказваюцца,* — нагадала спецыяліст. — *Калі чалавеку патрэбна толькі інфармацыя пра аб'екты, якія прапануюцца да здыму (адрасы), то заключаецца дагавор на аказанне* ***«паслугі па прадастаўленні інфармацыі аб попыце і прапанове на аб'екты нерухомасці»****.* У такім дакуменце трэба дакладна прапісаць патрабаванні да аб'екта, што вас цікавіць: кватэра ці пакой, кошт жылля і іншыя дэталі. Згодна з дагаворам, вам павінны прадаставіць інфармацыю аб здачы ў наём менавіта тых аб'ектаў, якія адпавядаюць абазначанаму ў дакуменце апісанню. Інфармацыя павінна прадастаўляцца пісьмова і быць дакладная.

**Мінус такога дагавора — вы аплачваеце атрыманне інфармацыі,** значыць, грошы аддаяце да таго, як знайшлі сабе падыходзячы варыянт.

### Падбор варыянтаў

Тым, хто шукае жыллё праз пасрэднікаў, пэўна, лепш скарыстацца іншай рыэлтарскай паслугай з больш прывабнымі для кліента ўмовамі — **«паслугай па падборы варыянтаў здзелкі з нерухомасцю (наём аб'ектаў жыллёвага фонду)»**, параіла прадстаўніца Мінюста:

*— У гэтым выпадку агенцтва прымае на сябе абавязацельствы не проста даць інфармацыю, а менавіта знайсці жыллё, якое будзе адпавядаць вашым пажаданням. І аплачваецца такая паслуга пасля таго, як нерухомасць падбяруць. З улікам шматлікіх парушэнняў пры аказанні паслуг у сферы арэнды лепш звяртацца менавіта па паслугу падбору варыянтаў жылля, а не прадастаўлення інфармацыі пра яго. Гэта сэканоміць грошы і час. Калі ў агенцтве кажуць, што такую паслугу не аказваюць, то гэта нагода задумацца пра іх адкрытасць і звярнуцца ў больш адказную арганізацыю.*

**Падводныя камяні часта хаваюцца ў змененых назвах арганізацый, дзейнасць якіх была забаронена за парушэнні, а яны адкрылі новую фірму, назва якой адрозніваецца ад папярэдняй адной літарай.**

Дарэчы, **кошт паслугі і па прадастаўленні адрасоў, і па падборы варыянтаў аднолькавы — пяць базавых велічынь**.

### Хто мае права аказваць паслугі

Звяртаючыся ў агенцтва, трэба ведаць, што рыэлтарскія паслугі маюць права аказваць толькі арганізацыі, якія маюць ліцэнзію на аказанне такіх паслуг, і дзяржаўныя рыэлтарскія арганізацыі. **Праверыць наяўнасць ліцэнзіі можна праз Адзіны рэестр ліцэнзій ці ў спісе рыэлтарскіх арганізацый на афіцыйным інтэрнэт-партале Мінюста**, паведаміла Таццяна Булах:

*— Такая праверка вельмі важная, бо здараецца, што за парушэнні ліцэнзію ў арганізацыі ўжо адклікалі, але яна працягвае працаваць. Зразумела, ніякай якаснай паслугі вы тут не атрымаеце.*

Аказваць рыэлтарскія паслугі таксама можа не кожны работнік агенцтва, гэта варта ведаць. Па кожным дагаворы прызначаецца адказны за яго выкананне рыэлтар. Часам замацоўваюцца і агенты па аперацыях з нерухомасцю. Пры гэтым і **ў рыэлтара, і ў агента павінен быць дакумент, які пацвярджае іх паўнамоцтвы на аказанне рыэлтарскіх паслуг**. Прозвішча рыэлтара, які павінен працаваць са спажыўцом, што заключыў дагавор на аказанне паслуг, указваецца, дарэчы, у самім дакуменце. Ніякія іншыя супрацоўнікі, за выключэннем абазначаных, аказваць паслугі не могуць.

*— На ідэнтыфікацыйнай картцы павінны быць імя, імя па бацьку і прозвішча спецыяліста; яго пасада і фатаграфія; назва рыэлтарскай арганізацыі, у штаце якой працуе работнік; рэквізіты ліцэнзіі арганізацыі; серыя і нумар карткі.* ***Аказанне паслуг без такога дакумента забаронена****,* — папярэдзіла спецыяліст. — *Калі чалавек адмаўляецца прад'явіць картку, — значыць, магчыма, з вамі працуе асоба, якая не мае гэта права.*

### Правільная рэклама

Каб з самага пачатку высветліць, што пасрэднік, магчыма, нядобрасумленны, трэба ведаць правілы рэкламавання нерухомасці. **Па аб'екце, які прапануецца рыэлтарскай арганізацыяй, павінны ўтрымлівацца назва дадзенай фірмы, уліковы нумар падаткаплацельшчыка, нумар і дата заключэння дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг, нумар і дата выдачы ліцэнзіі на права аказання рыэлтарскіх паслуг** (выключэнне адно — дзяржаўныя рыэлтарскія арганізацыі, ім ліцэнзія непатрэбная).

*— Калі арганізацыя рэкламуе аб'ект з парушэннем абазначаных патрабаванняў — такую рэкламу лепш абысці бокам, нягледзячы ні на якую прыцягальнасць жылля,* — парэкамендавала Таццяна Булах. — *Як правіла, пасрэднік, які змясціў неналежную рэкламу, намагаецца схаваць і іншыя парушэнні ў сваёй дзейнасці. Калі ў рэкламе не ўказаны, напрыклад, рэквізіты дагавора, магчыма, аб'ект рэкламуецца без законных на тое падстаў, і дагавора з уласнікам гэтага жылля ўвогуле няма. Можа быць і так, што рэкламаванага аб'екта проста не існуе, а інфармацыя размешчана, каб прыцягнуць як мага больш патэнцыяльных кліентаў колькасцю нібыта прапанаванага жылля. А назву арганізацыі не ўказваюць часта для таго, каб потым даказаць, што фірма і яе кіраўнік недатычныя — вінаваты супрацоўнік, што даў рэкламу, няхай ён і адказвае.*

Такі варыянт таксама нельга ўспрымаць за праўду, бо кіраўнік любой арганізацыі нясе адказнасць за дзеянні сваіх падначаленых. Менавіта ён павінен прымаць меры для належнай арганізацыі работы і забяспечваць умовы, каб работнікі вытрымлівалі патрабаванні заканадаўства.

*— Супрацоўнікам, якія намагаюцца так хітрыць, не варта спадзявацца, што меры будуць прынятыя толькі да кіраўніка арганізацыі і самой фірмы. Цяпер досыць лёгка ўстанавіць, хто і калі размясціў неналежную рэкламу, і яе аўтар таксама атрымае наступствы за свае беззаконныя дзеянні,* — нагадала прадстаўніца Мінюста.

### Адабраная ліцэнзія

Падводныя камяні часта хаваюцца ў змененых назвах арганізацый, дзейнасць якіх была забаронена за парушэнні, а яны адкрылі новую фірму, назва якой адрозніваецца ад папярэдняй адной літарай.

*—* ***Калі за парушэнні спыняюць дзеянне ліцэнзіі на аказанне рыэлтарскіх паслуг у пэўнай рыэлтарскай арганізацыі, юрыдычная асоба, пакараная такім чынам, можа атрымаць новую ліцэнзію толькі праз год****,* — акрэсліла спецыяліст. — *Але ж заснавальнік юрыдычнай асобы намагаецца абысці існуючыя абмежаванні. Напрыклад, стварае новую арганізацыю пад іншай назвай або прызначае замест сябе (бо яму пэўны час нельга займаць кіруючую пасаду) іншага кіраўніка. Тым не менш, калі патрабаванні закона, якія прад'яўляюцца да кампаніі, што ствараецца, вытрыманыя, ліцэнзію ёй выдадуць. Аднак такія фірмы заўжды пад асаблівым кантролем, і калі іх дзейнасць не зменіцца, то прымаюцца адпаведныя меры. І ў першую чаргу церпяць тыя, хто пагаджаецца быць кіраўніком ці рыэлтарам толькі «на паперы». Пагаджаючыся на такія нядобрасумленныя ўмовы, можна ўвогуле пазбавіцца права працаваць у сферы рыэлтарскіх паслуг.*

**Ірына СІДАРОК.**

### МЕРЫ ПРЫНЯТЫЯ

Спынена дзеянне ліцэнзій і двух агенцтваў: «Альфа ключ» і «Нерухомасць для ўсіх». Падставай стала паўторнае на працягу года парушэнне ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў пасля таго, як ім было вынесена паведамленне аб ліквідацыі аналагічных парушэнняў.

У агенцтве «Нерухомасць для ўсіх» дазвалялі сабе парушаць закон пры рэкламаванні аб'ектаў нерухомасці. Інфармацыя змяшчалася без законных падстаў і адсутнасці дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг з уласнікамі рэкламаваных кватэр. Часам рэклама давалася ад імя фізічнай асобы без указання наймення агенцтва. А зацікаўленым людзям па тэлефоне ўжо казалі, што гэта агенцтва, і каб паглядзець кватэру, трэба заключаць дагавор на аказанне паслуг і аплаціць іх.

У агенцтве «Альфа ключ» не вытрымліваўся парадак афармлення і рэгістрацыі дагавораў на аказанне рыэлтарскіх паслуг з грамадзянамі, якія звярнуліся па дапамогу ў найме жылля. На дакументах не было нумароў рэгістрацыі, сустракаліся розныя экзэмпляры аднаго і таго ж дагавора.

Прыняты меры і да супрацоўнікаў гэтых фірмаў. На год прыпынена дзеянне ідэнтыфікацыйнай карткі агента па аперацыях з нерухомасцю арганізацыі «Нерухомасць для ўсіх». Анулявана пасведчанне аб атэстацыі рыэлтара кіраўніка «Альфа ключ».

### ПАРАДЫ СПАЖЫЎЦАМ

**Калі вытрымліваць пэўныя правілы, можна не толькі абараніць свае правы, але і абцяжарыць доступ да аказання рыэлтарскіх паслуг нядобрасумленным пасрэднікам, упэўнена Таццяна Булах.**

Калі вы знайшлі прывабны рэкламаваны варыянт жылля, праверце, ад чыйго імя ён размешчаны і ці мае неабходныя рэквізіты. І памятайце, што ў гэтым выпадку вы не павінны заключаць дагавор ці плаціць агенцтву грошы за інфармацыю аб гэтай нерухомасці.

Калі заключаеце дагавор з агенцтвам, звяртайце ўвагу на прадмет дагавора (прадастаўленне звестак аб жыллі ці падбор варыянтаў нерухомасці). Уважліва вывучыце і іншыя ўмовы дакумента, у тым ліку парадак яго скасавання і магчымыя штрафы.

Працуйце толькі са сваім рыэлтарам ці агенцтвам па нерухомасці і прасіце прад'яўляць ліцэнзію і ідэнтыфікацыйную картку.

Заўжды патрабуйце дакумент, які пацвярджае факт аплаты.

Калі вы сутыкнуліся з агенцтвам, якое першапачаткова дзейнічае, парушаючы закон, не майце з ім ніякіх спраў.

Службовы патруль

# БАЙЦЫ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ

## На тры дні кіналагічны цэнтр унутраных войскаў у Магілёве стаў месцам спаборніцтваў для кінолагаў Беларусі і Расіі і іх чатырохногіх падапечных

**Тут праводзіўся XXII адкрыты чэмпіянат унутраных войскаў па службовым мнагаборстве кінолагаў. Акрамя зборных каманд і злучэнняў воінскіх часцей унутраных войскаў, свае навыкі дэманстравалі прадстаўнікі Дэпартамента выканання пакаранняў і Дэпартамента аховы МУС, галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, нацгвардыі Расіі. Ацэньваліся вынікі агульнай дрэсіроўкі і спецыяльнай падрыхтоўкі службовых сабак, іх здольнасць абшукваць памяшканні, псіхалагічная ўстойлівасць да стрэлаў, дзеянні пры затрыманні злачынцы, вобыску транспартных сродкаў, багажу і мясцовасці на наяўнасць выбуховых ды наркатычных рэчываў.**



Пераможцы чэмпіянату.

### «Немец» — гэта мерседэс, а «бельгіец» — хуткасная ферары

Для службовых сабак і іх гаспадароў іспытаў хапае і ў жыцці. Гэта іх шараговая служба. Але чэмпіянат дазваляе выявіць найлепшых, падказаць, куды можна развівацца далей і якіх вышынь дасягнуць. Гэтаму, як кажа **намеснік начальніка кіналагічнага цэнтра ўнутраных войскаў і суддзя спаборніцтваў Дзмітрый МІХАЛЕВІЧ,** неабходна вучыцца ўсё жыццё.

— Добрага кінолага трэба вырасціць, аднаго жадання ім быць мала — неабходны талент, — перакананы ён. — Для пачатку трэба любіць сабак. Астатняму — навучым. Я вось з 2000 года, моманту паступлення ў Пермскі ваенны інстытут, вучуся. Гэта цяжкая работа. Адна справа — засвоіць гэтую навуку самому, і іншая — перадаваць вопыт.



**Фёдар АНКУДЗІНАЎ займаецца любімай справай болей за чвэрць стагоддзя.**

Спаборніцтвы — даволі руцінны працэс. Для абывацеля нецікава назіраць, як сабака нешта там вышуквае, абнюхвае прадметы і памяшканні. Іншая справа — затрыманне злачынцы. Відовішча збірае шмат прыхільнікаў, бо эмоцыі зашкальваюць. На сабаку народ глядзіць з абагаўленнем. Які ж ён разумны, толькі што не гаворыць.

— Згодна з нарматывам, сабака павінен затрымаць злачынцу, адпусціць яго без каманды і, калі той паспрабуе збегчы, зноў затрымаць і канвайраваць, — расказвае Дзмітрый.

Любую сабаку можна навучыць працаваць па камандзе. У спаборніцтвах былі задзейнічаны бельгійская і нямецкая аўчаркі, ратвейлер, бігль, кокер-спаніэль.

— З улікам вопыту, яны больш падыходзяць для нашай службы, — кажа эксперт. — Універсальная парода — нямецкая аўчарка. Бельгійская больш шпаркая і часам назаменная, але не кожны можа прымусіць яе падпарадкоўвацца. Калі параўноўваць гэтыя дзве пароды з машынамі, то «немец» — гэта мерседэс, а «бельгіец» — хуткасная ферары. Калі за руль ферары сядзе чалавек, які толкам не можа ездзіць, ён проста яе разаб'е.

Выхаванне сабакі — справа тонкая. Напрыклад, нумар з затрыманнем чалавека патрабуе аддачы адразу двух спецыялістаў.

— У выхаванні сабакі задзейнічаны гаспадар і фігурант, — тлумачыць нюансы суддзя. — Кінолаг з аднаго боку павадка, а фігурант — з другога. Шчанюку зубы дадзеныя ад прыроды, а як карыстацца імі, яму «расказвае» маці. У дадзеным выпадку шчаня з двухмесячнага ўзросту расце з чалавекам, які вучыць правільна кусаць. Калі і фігурант, і сабака нявопытныя, нічога добрага не атрымаецца. Для маладога сабакі павінен быць вопытны фігурант, які дасць пуцёўку ў жыццё. Ад гаспадара і фігуранта залежыць, якім будзе сабака. І па-іншаму нічога не атрымаецца.

### Прафесія — радзіму абараняць

На спаборніцтвы прыехалі прадстаўнікі нацгвардыі Расіі. Гэта традыцыя існавала і раней, летась яна перарвалася з-за пандэміі. Але сёлета аднавілася.

Фёдар Анкудзінаў прыехаў у Магілёў у складзе каманды з Ніжняга Ноўгарада ўпершыню. З сабой расіяне прывезлі дзвюх бельгійскіх і нямецкую аўчарак. Занялі ў асабістым заліку першае месца сярод спецыялістаў-кінолагаў вышуковых і патрульна-вышуковых сабак і трэцяе — сярод сапёраў.

— Я задаволены нашым выступленнем, — прызнаецца Фёдар. — Нашы сабакі добра падрыхтаваныя і не падвялі. Канкурэнтаў было шмат. На жаль, крыху хваляваліся. Але так бывае, калі прадстаўляеш краіну, паказваць навыкі ў такой сітуацыі цяжэй. У звычайным жыцці займаемся аховай грамадскага парадку і часта затрымліваем злачынцаў. Нашы сабакі могуць знаходзіць выбуховыя рэчывы, небяспечныя сродкі часоў вайны, весці пошук па слядах. Усё гэта для нас — звычайная работа.

Любімай справай Фёдар займаецца дваццаць сёмы год. Менавіта столькі ён працуе кінолагам. Успамінае, што з дзяцінства любіў сабак, і дзякуй суседу-прыяцелю, які падказаў, дзе вучаць на кінолагаў. За болей чым чвэрць веку суразмоўнік падрыхтаваў не адну тысячу сабак.

— Усе яны служаць на карысць дзяржавы, — усміхаецца кінолаг. — Бо наша галоўная прафесія — радзіму абараняць.

Рэдкі кінолаг не мае сваёй сабакі. Фёдар не выключэнне. У яго сям'і жывуць нямецкі ягдтэр'ер і заходнесібірская лайка. На другім месцы пасля сабак у суразмоўніка паляванне. І сабакі складаюць яму кампанію.

— Для ўсёй нашай сям'і яны радасць, — прызнаецца кінолаг. — Сабакі вельмі сацыялізаваныя жывёлы, для нас з жонкай і сынам яны як члены сям'і. Вядома, было б прыемна ўбачыць у сыне пераемніка. Ён таксама любіць сабак, але па-іншаму. На першым месцы для яго — дакладныя навукі.

Расійскім кінолагам спадабалася ў Беларусі. Яны казалі пра тое, што арганізацыя мерапрыемства вельмі высокая. Яны атрымалі шмат яркіх уражанняў і незабыўных эмоцый. Асабліва кранула вельмі цёплы прыём.

### Цэнтр працуе на выдатна

У чэмпіянаце прымалі ўдзел 47 прадстаўнікоў сілавых ведамстваў: 27 з іх спецыялізаваліся на агульным вышуку, 8 — на вышуку наркатычных рэчываў і 12 — на вышуку выбуховых рэчываў. Спаборніцтвы праходзілі на васьмі пляцоўках кіналагічнага цэнтра, які знаходзіцца ў Магілёве на базе вайсковай часці 6713. Тут ёсць складаная паласа перашкод, імітацыя вытворчых аб'ектаў, грузавога транспарту. Ацэньвалі работу ўдзельнікаў 14 суддзяў. Было шмат перамог у асабістых заліках, але самы высокі камандны вынік на ўліку кіналагічнага цэнтра вайсковай часці 6713. Каманда з чатырох чалавек у пары з сабакамі прадэманстравала найлепшыя вынікі па агульна-пошукавым курсе, па пошуку выбуховых рэчываў, пошуку наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.

— Мы проста шчаслівыя, — задаволены выступленнем каманды яе прадстаўнік Валерый Ермакоў. — Вельмі прэстыжна стаць пераможцам у камандным заліку адкрытага чэмпіянату. Вунь колькі падарункаў зарабілі!

У звычайным жыцці кіналагічны цэнтр унутраных войскаў вядзе падрыхтоўку спецыялістаў з ліку салдат тэрміновай службы і займаецца падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай спецыялістаў-кінолагаў па кантракце. Як паказаў чэмпіянат, цэнтр працуе на выдатна. Да ведама: падрыхтоўкай кінолагаў для арміі і міліцыі ў Беларусі займаецца ўсяго чатыры цэнтры — у Мінску (Узброеныя Сілы), Смаргоні (пагранічнікі), Магілёве (Унутраныя войскі) і Мінскай вобласці (Дэпартамент аховы праваапарадку). У магілёўскім, напрыклад, такую навуку дапамагаюць асвойваць шэсць настаўнікаў. І гэта менавіта іх заслуга, што магілёўскія кінолагі аказаліся на вышыні. Хоць, як сведчыць Дзмітрый Міхалевіч, агульны ўзровень падрыхтоўкі кінолагаў усіх цэнтраў высокі і працягвае расці.

— З кожным годам удзельнікі становяцца мацнейшыя, — сведчыць ён. — І гэты чэмпіянат паказаў, што тыя, хто яшчэ летась быў аўтсайдарам, сёлета сярод найлепшых. Той жа Аляксандр Мазур са сваім сабакам Грэйсам заняў першае месца па пошуку выбуховых сродкаў, хоць летась быў на перадапошнім. За год вельмі адчувальна вырас.

Службовыя сабакі ў сённяшнім не такім ужо і спакойным жыцці выконваюць сапраўды вялікую ролю. Яны задзейнічаны ў пошуку наркатычных або выбуховых сродкаў, дапамагаюць забяспечваць ахову высокіх службовых асоб. Як толькі пачынаецца сезон ціхага палявання, кінолагі рэгулярна выязджаюць на пошукі людзей, якія згубіліся ў лесе. Без удзелу кінолагаў і іх чатырохногіх выхаванцаў не абыходзіцца ніводны футбольны матч, ніводны фестываль. Толькі пасля таго, як тэрыторыю правераць на «чысціню», прапускаюць гледачоў.

Трымаць сябе ў форме кінолагам дапамагаюць падобныя спаборніцтвы. Прадстаўнікі кіналагічнага цэнтра ўнутраных войскаў перыядычна выязджаюць на спаборніцтвы ў Расію, праходзяць навучанне ў расцоўскім кіналагічным цэнтры «Скіф».

— Чым запомніліся гэтыя спаборніцтвы? — цікаўлюся напаследак у Дзмітрыя Міхалевіча.

— Добрым надвор'ем, — усміхаецца ён. — У апошні дзень пайшоў дождж, але асноўныя спаборніцтвы адбыліся, калі было суха. Гэта наогул першы чэмпіянат на маёй памяці, калі не было дажджу. У папярэднія прамакалі настолькі, што па некалькі разоў пераапраналіся. А сабакі, як і людзі, любяць камфорт. Мокрым хадзіць нават сабаку не падабаецца. Яны тады менш актыўныя. А яшчэ гэты чэмпіянат запомніцца тым, што яго ўдзельнікі сталі больш працаваць над паслушэнствам. Калі «бельгіец» аддана глядзіць у вочы свайму гаспадару, гэта радуе. Значыць, у яго добры кантакт з чалавекам. Такога дрэсіроўкай не дабіцца. Тут сабака робіць не з палкі, а ў задавальненне. Прыемна, што такіх людзей стала шмат. Гэта — новая хваля. Калі чалавек і сабака — адзінае цэлае, спецкурс даецца лёгка. Раней сабака менеей давяраў гаспадару, чакаў падказкі, аглядваўся на яго, баяўся памыліцца. Значыць, ён рабіў нешта не так, і сабака яго сцярогся. А тут — поўная ідылія.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота аўтара і з архіва Галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі МУС РБ.**

### Карысная парада ад Дзмітрыя Міхалевіча для жадаючых узяць шчанюка:

— Калі бярэш сабаку, павінен ведаць, навошта (для аховы?), дзе ён будзе жыць (у аднапакаёўцы, дзе пяць чалавек на 20 метраў?), хто за ім будзе глядзець. Бывае, бяруць для дзіцяці, а выгульваюць бацькі. Гэта няправільна. Сабака — не хамячок, у яго павінен быць адзін гаспадар, які будзе яго карміць, выгульваць і выхоўваць. Вось зараз у модзе пінчары, падушачныя сабакі. Яны якраз і выводзіліся для таго, каб сядзець у дамскіх сумачках і хапаць кішэннікаў за пальцы. Калі чалавек заводзіць пінчара ў сваёй малагабарытнай кватэры — гэта больш чалавечна, чым калі б ён прывёў туды дога. Трэба несці адказнасць за тых, каго прыручыў.

### Пераможцы ў асабістых заліках

**По вышуку наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў:**

***Старшы прапаршчык Раман Мароз з вышуковым сабакам Мэрсам, кіналагічны цэнтр Унутраных войск.***

**Сярод спецыялістаў-кінолагаў (сапёраў):**

***Прапаршчык Аляксандр Мазур з вышуковым сабакам Грэйсам, вайсковая часць 5448.***

**Сярод спецыялістаў-кінолагаў вышуковых, патрульна-вышуковых сабак:**

***Капітан Максім Глушкоў з вышуковым сабакам Трэкерам, войскі нацгвардыі Расіі.***

**Пераможцы ў камандным заліку:**

**Абсалютны пераможца — *кіналагічны цэнтр Унутраных войск.***

**На другім месцы — *вайсковая часць 6713.***

**На трэцім — *вайсковая часць 7404.***





# ШЛЯХ ДА ДАБРА І РАЗУМЕННЯ,

## або Якім каштоўнасцям вучаць сведкі Халакосту?

**Мінулай восенню прайшоў невялікі юбілей, які з-за пандэміі застаўся незаўважаным, — 20 гадоў таму ў вёсцы Парэчча Пухавіцкага раёна адкрыўся першы ў Беларусі помнік праведнікам свету. Тут у гады вайны, рызыкуючы ўласным жыццём, мясцовыя жыхары хавалі дзяцей, выведзеных з Мінскага гета. Можна сказаць, што менавіта з усталявання помніка ў Парэччы і пачалося для нашай краіны вывучэнне тэмы Халакосту.**

Асэнсаванне гэтай праблемы прайшло некалькі этапаў: ад амаль татальнай табуізацыі ў пасляваенны час да абуджэння цікавасці дзякуючы масавым публікацыям на хвалі перабудовы ў 90-я гады і афіцыйнага прызнання Халакосту ў пачатку гэтага стагоддзя. Тым не менш яшчэ нельга адназначна сказаць, што ў свядомасці ўсіх беларусаў Халакост дакладна разумееца як асобны элемент трагедыі Вялікай Айчыннай вайны.

### НЕ ТОЛЬКІ ГІСТОРЫЯ

За час Другой сусветнай вайны было знішчана шэсць мільёнаў яўрэяў, каля 800 тысяч з іх былі жыхарамі Беларусі. Штогод у Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту ў розных краінах свету людзі не проста згадваюць трагедыю, але і абмяркоўваюць шляхі папярэджання падобнага ў будучыні. «Кожнае пакаленне праходзіць этап, калі трэба выбіраць паміж дабром і злом. Вывучаючы гэтую тэму і спрабуючы зрабіць яе і сённяшнім болем, мы якраз выбіраем той самы шлях да дабра і разумення адно аднаго», — лічыць **намеснік старшыні Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Барыс ГЕРСТАН.**

Распрацоўка тэмы Халакосту — гэта і выдатная падказка, як наогул падаваць трагічныя старонкі гісторыі (а для нашай зямлі, дзе загінуў кожны трэці, гэта асабліва важна), бо, на жаль, да гэтага часу мы ўсё яшчэ вучымся працаваць з культурай памяці. Сёння яшчэ і даводзіцца супрацьстаяць фальсіфікацыям.

**Калі скажу, што па правым баку, калі стаіш тварам да вуліцы Мяснікова, цякла па бардзюры рака крыві, ніхто не паверыць. У скверы каля кінатэатра «Беларусь» людзі віселі тыднямі, іх забаранялі здымаць.**

«Усё больш становіцца відавочным, што вывучэнне Халакосту — не толькі гісторыя. Грамадства мае патрэбу ў вывучэнні гэтай тэмы і ў іншых дысцыплінах: літаратуры, грамадазнаўстве. Існуе шмат даследаванняў Халакосту і з пункту гледжання філасофіі, палітыкі, эканомікі і нават генетыкі. Тым не менш застаецца пытанне: наколькі інтэграваны ў нашым грамадстве веды, якія на гэтых даследаваннях заснаваны? Ці часта мы задумваемся аб складніках катастрофы, аб дыскрымінацыі, аб антысемітызме, гвалце, парушэнні правоў чалавека? Ці часта пытаем у сябе, наколькі веды аб Халакосце ўплываюць на нашы дзеянні ў дзяржаве



Фрыда РЭЙЗМАН каля помніка праведнікам свету ў вёсцы Парэчча Пухавіцкага раёна.

і грамадстве? — заўважае **старшыня праўлення Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Узаемапаразуменне» Анжаліка АНОШКА.**

### «Я САМА САБЕ НЕ ВЕРЫЛА...»

Фрыдзе Рэйзман, калі пачалася вайна, было пяць гадоў. Яна перажыла пяць з шасці пагромаў Мінскага гета. Па перапісе 1939 года ў Мінску пражывала 250 тысяч чалавек, 70 працэнтаў з іх былі яўрэямі. Афіцыйна названа лічба вязняў Мінскага гета — 100 тысяч чалавек, хаця жанчына ўпэўнена, што ахвяр было больш: «Ніхто не лічыў забітых. Вады, ежы не было. Кожны дзень ад голаду, холаду і хвароб паміралі тысячамі. Людзі не маглі іх пахаваць, трупы выкладвалі каля ганка, і існавала каманда, якая збірала іх. Немцы прымяркоўвалі пагромы да савецкіх ці яўрэйскіх свят. Ці «бралі» некалькі вуліц, а суседня не чапалі. Аднойчы на вуліцы Абутковай быў пагром. Пасля маці пайшла туды, а я за ёй. У скверы каля кінатэатра «Беларусь» людзі віселі тыднямі, іх забаранялі здымаць. Я сама сабе не верыла, пакуль у брашуры з успамінамі не прачытала, як іншая сведка піша пра тое ж самае. Калі скажу, што па правым баку, калі стаіш тварам да вуліцы Мяснікова, цякла па бардзюры рака крыві, ніхто не паверыць. У цагляным двухпавярховым дамку юдэнрат вырашыў змясціць усіх сірот проста пад дахам, дзяцей не было чым карміць. Калі мая маці магла дастаць мукі, то варыла зацірку ў вядры і насіла іх карміць. У адзін дзень па гета разнеслася, што дзяцей выразалі проста ў ложках... Я не разумею выказвання: «Прыгажосць уратуе свет». Прыгажосць праходзіць, а дабрыня застаецца вечна. І я прашу, каб толькі дабро кіравала людзьмі свету».

Міхаіл Розеншэйн нарадзіўся ў верасні 1940 года, яму не было і года, калі ён трапіў у Беластоцкае гета разам з маці і сваякамі. Пасля смерці маці застаўся на руках у сястры бацькі, якая змагла перадаць хворага хлопчыка польскай дзяўчыне. Калі тая дома паклала дзіця з гета, родныя яе спыталі: «Навошта прынесла гэты труп?»

Аляксандра Барысава прайшла лагеры «Пяты полк» у Віцебску, Майданэк і Аўшвіц. Менавіта яна была адным з першых беларускіх аўтараў успамінаў пра тыя жахлівыя падзеі. «Пасля вайны я многа хварэла, у школе мне не рабілі прышчэпкі. У 1950—1960 гадах, ужо студэнткай, мяне не пакідалі кашмары, я папярэджвала дзяўчат, з якімі жыла ў інтэрнаце, што магу ўскрыкваць, падымацца з ложка».

Былыя вязні пакляліся змагацца супраць нацызму, уключыліся ў адукацыйную работу, удзельнічаюць у здымках дакументальных фільмаў, інтэрв'ю, сустракаюцца з дзецьмі і моладдзю Беларусі і іншых краін.

### ВАРТЫЯ ПАВАГІ І ЎВАГІ!

У Беларусі цяпер пражывае больш за дзве тысячы людзей, якія пацярпелі ад Халакосту. Гэта не толькі вязні гета і канцлагераў, а таксама тыя яўрэі, якія з-за сваёй этнічнай прыналежнасці вымушаны былі хавацца ад праследу на акупаванай тэрыторыі альбо шукаць паратунку ў эвакуацыі. Многія ў вайну страцілі ўсё: і дом, і сям'ю. А сталінская догма, што не можа і не павінна быць асаблівага «яўрэйскага лёсу» ў савецкіх людзей, аказвае свой уплыў і цяпер. Натуральна, людзі не хацелі і баяліся распавядаць пра тое, што перажылі. А гэты страх не даваў магчымасці вучыцца, развівацца і ўладкоўвацца ў жыцці. Сёння гэтыя састарэлыя не маюць нейкага асаблівага, замацаванага заканадаўствам статусу, дадатковых ільгот ці паслуг. Пэўная падтрымка ахвяр Халакосту ў нашай краіне ў асноўным з'яўляецца зонай адказнасці грамадскіх арганізацый, у тым ліку і забеспячэнне сведкам ваенных падзей псіхолага-сацыяльнай рэабілітацыі.

### МАСТОК У МІНУЛАЕ

А як далей будзе развівацца памяць аб ваенных трагедыях, асабліва з сыходам сведкаў тых падзей? Сёння з'явілася новая група даследчыкаў, якая стала «мастком», што злучае гісторыю і будучыню, — гэта настаўнікі школ. З веданнем ландшафту, гісторыі, фактуры гэтыя людзі разам са сваімі вучнямі здабываюць матэрыял, у тым ліку важны для мемарыялізацыі Халакосту.

Напрыклад, такую работу вядуць настаўнікі Лагойшчыны, дзе ў гады вайны было знішчана каля тысячы яўрэяў (акт захавання на месцы расстрэлу ўтрымлівае толькі 25 прозвішчаў). Вядуцца даследаванні і ў невялікіх населеных пунктах Маладзечанскага раёна — Чырвонае і Гарадок. Так, вучні Гарадоцкай сярэдняй школы разам з настаўнікамі распрацоўваюць турмаршрут па мясцінах памяці Вялікай Айчыннай вайны. А самая першая краязнаўчая школа, якая стала распрацоўваць ваенную тэматыку, знаходзіцца ў Мар'інай Горцы.

Яшчэ адна ініцыятыва працуе ў Вілейцы — там стварылі праект помніка, які расказа пра трагедыю населенага пункта і актыўнае супраціўленне (вядомы вывад 300 чалавек праз лінію фронту афіцэрам Чырвонай Арміі), а таксама захавае імёны праведнікаў, якія выратоўвалі ў раёне яўрэйскае насельніцтва.

Вядзецца і новы пошук тэм для дыялогу з падрастаючымі пакаленнямі аб Халакосце. Гісторыя становіцца больш зразумелай дзецям, калі яны адчуваюць, што трагедыя адбывалася не так даўно і побач з тымі месцамі, дзе яны жывуць. Так, у турыстычных і адукацыйных мэтах ужо выкарыстоўваецца аўдыягід, аздоблены ўспамінамі сведак пра гета Гродна (а таксама створаны праект і «Гарадзенскае гета ў інфаграфіках»). Важна гаварыць не толькі пра трагедыі, але і пра тое, якім было жыццё да вайны і які след застаўся ад людзей, у гады вайны асуджаных на пакуты.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## У рэгіёне

### ВЫСТАВА Ў ПОЛАЦКУ ПАКАЖА, ЯК ЖЫЛІ ШКОЛЬНІКІ 150 ГАДОЎ ТАМУ

**У Дзіцячым музеі Полацка 1 верасня адкрыецца выстава «З гісторыі школьнага сшытка XIX стагоддзя», якая не пакіне абыякавымі ні дзяцей, ні дарослых.**

«Што, калі табе трэба будзе ўпершыню ў жыцці паставіць у сшытак кляксу і даведацца, як яе вывесці з дапамогай нейкай прамакашкі? Або запісаць тэкст пёравай ручкай у пропісе, а не набраць на клавіятуры? Або сесці за парту, за якой сядзелі твае аднагодкі сто гадоў таму? У гэтым выпадку школьныя прадметы ператвараюцца ў сапраўдныя артэфакты, а наведванне выставы становіцца падарожжам у дакамп'ютарную эру», — запрашае музей.

Гасцей чакаюць прыналежнасці, звыклыя для нашых продкаў, але загадкавыя для сучаснага чалавека. Можна будзе даведацца, па якіх падручніках вучыліся прапрабабкі і прапрадзядулі, мамы і таты: з чым яны хадзілі ў школу, чым і на чым пісалі і лічылі, што вывучалі. Усе жадаючыя, хто прыйдзе, пабываюць на ўроку ў старой школе, даведаюцца, як жылі школьнікі 150 гадоў таму, і разгадаюць таямніцы старадаўніх прадметаў, якіх не сустрэнеш у доме XXI стагоддзя.

Выставу можна наведаць да 20 лістапада.

### ЖЫХАР ГРОДНА ВЫКРАЎ У БАНКА БОЛЬШ ЗА 14 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ І ПАТРАЦІЎ НА СВАЁ ВЯСЕЛЛЕ

**Гродзенскі міжраённы аддзел Следчага камітэта завяршыў расследаванне крымінальнай справы аб махлярстве ў буйным памеры.**

З матэрыялаў справы вынікае, што 30-гадовы жыхар Гродна з 2020 года быў зарэгістраваны ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Для вядзення рознічнага гандлю мужчына адкрыў краму, у банку аформіў дагавор эквайрынгу і атрымаў банкаўскі тэрмінал. У лютым 2021 года мясцовы жыхар спыніў дзейнасць, аднак дамову не скасаваў і тэрмінал не вярнуў. «Дамова эквайрынгу вызначае парадак і ўмовы ажыццяўлення плацяжоў і разлікаў з арганізацыямі гандлю па аперацыях з выкарыстаннем тэрмінальнага абсталявання, праведзеным пры выкарыстанні банкаўскіх плацежных картак», — растлумачылі ў СК.

Падчас допыту абвінавачаны расказаў, што яму вельмі патрэбны былі грошы на ўласнае вяселле, у сувязі з чым ён прыдумаў незаконны спосаб заробку. З лютага па сакавік гэтага года, маючы ў карыстанні банкаўскі тэрмінал, ён ажыццяўляў дзеянні па адмене неіснуючых аперацый і вяртанню грошай на асабістыя банкаўскія карткі. Усяго мужчына выкраў у банка больш Br14 тыс. Грошы, здабытыя злачынным шляхам, мужчына патраціў на вяселле.

Абвінавачаны віну ў здзяйсненні злачынства прызнаў цалкам і кампенсаваў маёмасную шкоду банку ў поўным аб'ёме.

### ЖЫХАРКА ЛІДЫ ЗНАЙШЛА ГРЫБ-ГІГАНТ ВАГОЙ БОЛЬШ ЗА 5,5 КГ

**Лідчанка Альбіна Кажухоўская прыехала да бабулі на канікулы ў в. Верх-Крупава, выйшла прагуляцца і ў полі недалёка ад вёскі натыкнулася на грыб-гігант.**



Прынесла дадому, бабуля паклала на вагі — заважыў больш за 5,5 кг. Разрэзалі — па структуры, кажуць, як сыр, а пах — ярка выражаны грыбны.

Хоць і лічыцца порхаўка ядомым грыбам, прыгатаваць з яго нешта, праўда, пакуль не адважыліся.

Дарэчы, сям'я Кажухоўскіх — шматдзетная, у ёй выхоўваюцца пяцёра дзяцей. Дакладней, яны ўжо выраслі. Альбіна — малодшая, у яе чацвёра старэйшых братоў. Ды і сама дзяўчынка пойдзе ўжо ў 9-ы клас. На канікулы яна прыехала пасля спартыўнага лагера, а вучыцца ў Гродне, у вучылішчы алімпійскага рэзерву.

100 рэчаў, якія трэба зрабіць у Беларусі

# АДЧУЦЬ ПОДЫХ ГІСТОРЫІ, КАБ СТВАРАЦЬ СУЧАСНАЕ

## Вёска Моўчадзь як жывы этнаграфічны музей




**У 2016 годзе Нацыянальнае агенцтва па турызме выпусціла брашуру «100 рэчаў, якія патрэбна зрабіць у Беларусі». «Звязда» вырашыла кінуць сабе выклік і выканаць як мага больш пунктаў з гэтага спісу. І расказаць чытачам, што з гэтага атрымалася.**



У спісе рэчаў, якія неабходна зрабіць у Беларусі, пад пунктам 38 значыцца — «з'ехаць з ажыўленай трасы і пракласці маршрут праз некалькі беларускіх вёсак, каб пазнаць сапраўдную Беларусь». Такая вёска, у якую варта заехаць, знаходзіцца за 36 кіламетраў ад Баранавіч — гэта Моўчадзь, адна са шматлікіх частак «сапраўднай Беларусі». Завочную экскурсію па Моўчадзі для чытачоў «Звязды» правёў баранавіцкі **гісторык Васіль ДУБЕЙКА.**

«Нягледзячы на тое, што сама Беларусь, на першы погляд, мае нейкі адзіны лёс з аднымі і тымі ж падзеямі, у кожнага паселішча, нават самага маленькага, ёсць свая гісторыя. Яно адрозніваецца ландшафтам, людзьмі, кожны чалавек — гэта асобная гісторыя. І з лёсу кожнага чалавека складваецца гісторыя паселішча. І Моўчадзь — адметнае месца», — адзначае Васіль Дубейка.

Летапісная гісторыя населеных пунктаў Баранавіччыны пачынаецца з канца XIV — пачатку XV стагоддзя. Акцэнт — на слова «летапісная». Васіль Міхайлавіч тлумачыць, што XIV стагоддзе гісторыкі лічаць непісьменным. Захавалася вельмі мала дакументаў, якія давалі б магчымасць праліць святло на гісторыю Беларусі, асабліва на гісторыю асобных паселішчаў. Са школьнага курса гісторыі вядома, што датай заснавання паселішча лічыцца яго першае згадванне ў гістарычных крыніцах. Хоць зразумела, што людзі на гэтых тэрыторыях жылі і раней. Моўчадзь — не выключэнне.



«На сумежжы Навагрудскага і Слонімскага паветаў (цяперашняя тэрыторыя Баранавіцкага раёна) у канцы XIV — пачатку XV стагоддзяў згадваецца пяць-шэсць паселішчаў, якія сёння можна лакалізаваць. Сярод іх і Моўчадзь, таму можна сказаць, што гэта самае старажытнае паселішча на тэрыторыі Баранавіцкага раёна», — падкрэслівае Васіль Дубейка.

Гістарычныя дакументы сведчаць, што ў той час Моўчадзь была буйным населеным пунктам, цэнтрам вялікакняжацкай воласці, даходы ад якой атрымлівалі вялікія князі. А яны ў сваіх валасцях актыўна ўзмацнялі пазіцыі каталіцтва. Менавіта гэтым планам адпавядала будаўніцтва касцёла Святой Тройцы ў Моўчадзі, першага храма лацінскага абраду на тэрыторыі Баранавіцкага раёна.

«1 жніўня 1422 г. моўчадскі стараста выдае фундуш на забеспячэнне дзейнасці касцёла Святой Тройцы, Святых апосталаў Пятра і Паўла і Ушэсця Найсвяцейшай Панны Марыі. Запісам надавалася нейкая маёмасць касцельным служкам. Менавіта 1 жніўня 1422 г. — першая дакладная дата, якая дае нам права казаць, што Моўчадзь заснаваная ў 1422 годзе», — звяртае ўвагу Васіль Дубейка. Так, у наступным годзе Моўчадзь адзначыць сваё афіцыйнае 600-годдзе.

### УСМЕШКА ГІСТОРЫІ І ЯЕ ЛАБІРЫНТЫ...

Здавалася б, дата заснавання вядомая. Але гісторыя з характэрнай для яе іроніяй зрабіла Моўчадзь яшчэ больш адметным мястэчкам, даўшы вёсцы некалькі «дзён нараджэння». «Ёсць вельмі важны гістарычны дакумент — «Літоўскі дарожнік», складзены ў Тэўтонскім Ордэне, які з'яўляецца найкаштоўнейшай крыніцай па гістарычнай геаграфіі. Ордэн часта ваяваў з Вялікім Княствам Літоўскім і жадаў дакладна ведаць абстаноўку на тэрыторыі суседскай дзяржавы. Ён меў тут сваю агентуру, якая даносіла пра дарогі, паселішчы ВКЛ. І ў адным са 100 маршрутаў па Жамойці і Літве тэўтонскі агент згадвае пераправу праз раку Моўчадзь. А ў той час паселішчы ўзнікалі пераважна на берагах рэк. Гэты дакумент быў складзены ў 1401—1404 гадах, і я думаю, што паселішча каля гэтай пераправы ўжо існавала», — расказвае гісторык. Магчыма, што Моўчадзь варта адзначаць свой 620-гадовы юбілей у 2021 годзе. Але, як вядома, гісторыя не ведае ўмоўнага ладу.

Цікава, што дарогу, якую згадваюць тэўтонцы, існавала стагоддзямі. «У 1501-м гэтай дарогай з пасольствам у Маскву ехаў дыпламат Свяшчэннай Рымскай Імперыі Зігмунд Герберштэйн. У сваіх успамінах ён пісаў пра Молчар, адзначаючы, што гэта драўляны горад, якія звычайна будуюць у Літве. Такім чынам, і інфармацыя ў «Літоўскім падарожніку», і ўспаміны еўрапейскага дыпламата гавораць нам, што гэта вельмі старажытнае і вельмі значнае паселішча», — упэўнены Васіль Міхайлавіч.

### ...І ВЫКЛІКІ ЧАСУ

На жаль, моўчадскі касцёл не захаваўся. Пасля Вялікай Айчыннай вайны савецкія ўлады ператварылі яго ў клуб, а затым і ўвогуле разабралі. Старажылы ведаюць толькі месца, дзе стаяла святыня: акурат за праваслаўнай царквой святых апосталаў Пятра і Паўла, гісторыя якой вядзецца з XVI стагоддзя. Магчыма, калі б касцёл выстаяў перад выклікамі часу, Моўчадзь сёння была б цікавая яшчэ і з пункту гледжання рэлігійнага турызму. Доўгі час тутэйшыя праваслаўныя і каталікі жылі ў згодзе, карысталіся агульнымі могілкамі. Але ў 1838 годзе каталікам загадалі знайсці іншае месца для пахавання сваіх блізкіх і забаранілі правіць службу па нябожчыках у капліцы на старых могілках. А ў той капліцы знаходзілася скульптура каталіцкага святога Антонія Падуанскага. Яе лічылі цудадзейнай і з малітвамі прыходзілі вернікі двух веравызнанняў. Культ святога моўчадскія хрысціяне шанавалі да пачатку XX стагоддзя, нават калі скульптуру замянілі на абраз Антонія Пячэрскага.

Сёння ў вёсцы ёсць каталіцкі храм, пабудаваны ў 90-х гадах мінулага стагоддзя. Ды, шчыра кажучы, такой цікавасці сярод турыстаў ён не выклікае, чаго нельга было б сказаць пра касцёл XV стагоддзя. (Але памятаем пра адносіны гісторыі і ўмоўнага ладу.)

Царква святых апосталаў Пятра і Паўла сёння — адна з галоўных славутасцяў Моўчадзі, якая можа прыцягваць да сябе турыстаў і вернікаў. У XVI—XVII стагоддзях тут было дзве царквы — адну ў 1555 годзе заснаваў сам вялікі князь Жыгімонт Аўгуст II. У 1852 годзе ў вялікім пажары царква згарэла. І набажэнствы сталі праводзіць у невялікай капліцы на вясковых могілках. Пасля па загадзе губернскіх уладаў праваслаўным вернікам нават перадалі моўчадскі касцёл. Але з 1869 года пачалося будаўніцтва новай царквы, у якім удзельнічалі ўсе. І ў 1873 годзе ў Моўчадзі быў асвечаны новы храм і з таго часу ён ніколі не закрываўся. Сёння госці Моўчадзі могуць пазнаёміцца з унікальным абразам святога Аляксандра Неўскага 1861 года.

### ГІСТОРЫЮ РОБЯЦЬ ЛЮДЗІ

Лёс Моўчадзі звязаны з выдатнымі дзеячамі беларускай гісторыі. «Вядомы дакумент 1487 года, у якім вялікі князь ВКЛ Казімір выдае прывілей на атрыманне прыбытку з Моўчадскіх корчмаў вядомаму дзяржаўнаму дзеячу Аляксандру Солтану, заснавальніку шляхецкага роду Солтанаў. Гэты род мае дачыненне да заснавання знакамітага Жыровіцкага манастыра. Згадка ў гістарычных крыніцах корчмаў або таргоў з'яўляецца доказам таго, што сяло ўжо было рэарганізавана ў буйное рамесна-аграрнае паселішча. Якраз Моўчадзь — гэта першае з вядомых мястэчак на тэрыторыі сучаснага Баранавіцкага раёна. І гэта вельмі адметна», — расказвае Васіль Дубейка.

**Моладзь заклапочаная не столькі асэнсаваннем таго, што было, колькі прадчуваннем таго, што будзе.**

У XVI—XVII стагоддзях Моўчадзь заставалася ва ўласнасці вялікага князя. Мясцовы феадальны двор быў цэнтрам вялікай акругі са статусам староства, даходы з якога атрымлівалі прадстаўнікі найвядомейшых родаў Валовічаў і Сапегаў. У 1661 годзе за заслугі ў вайне Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай (1654—1667) староства з мястэчкам атрымаў ва ўласнасць Мікалай Уладзіслаў Юдыцкі, рэлігійны, дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ.

«У пачатку XIX стагоддзя маёнткам Моўчадзь з цэнтрам у двары Дабраполь валодае Ёсафат Булгак — апошні ўніяцкі мітрапаліт ВКЛ. Ён быў гарачы прыхільнік саюзу паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. Лічыў, што менавіта унія вядзе да сапраўднага саюзу паміж хрысціянамі розных канфесій. А калі той памёр, уніяцкая царква страціла ўплывовага абаронцу, што стала падставай для расійскіх уладаў актыўна працаваць над ліквідацыяй уніі», — паведамляе Васіль Міхайлавіч.

Мястэчка Моўчадзь заставалася буйным паселішчам да пачатку XX стагоддзя. Лічылася значным месцам і ў 1930-я гады, калі ўваходзіла ў склад Польшчы. «Неабходна адзначаць, вылучаць такія паселішчы, каб разумець, што карані ў нас глыбокія. І гісторыя ў нас багатая. Гэта стварае падмурак, грунт, які дае права лічыць сябе народам з адметнай гісторыяй і культурай», — упэўнены Васіль Дубейка.

### КРОПКА НА «НАСТАЛЬГІЧНАЙ» КАРЦЕ

Юбілей Моўчадзі ў наступным годзе — адна з падстаў адзначыць гісторыю гэтай вёскі. Для таго каб сучасная Моўчадзь была не менш адметная, чым мінулае, плануецца пабудаваць трасу для заняткаў маўцінбайкам — гэта язда на роварах па няроўнай, гарыстай мясцовасці. Няроўны рэльеф дазваляе. Тым больш, прырода сама стварыла для гэтага ўсе ўмовы, і вялікіх, асабліва фінансавых, намаганняў для гэтага не патрабуецца, упэўнены мясцовыя актывісты.

Сёння папулярнасць набывае настальгічны турызм. Абмежаваныя пандэміяй людзі больш знаёмяцца з роднай краінай, вяртаюцца да сваіх каранёў. Моўчадзь з яе гісторыяй дакладна не згубіцца на «настальгічнай» карце Беларусі. Бо адзін з пунктаў святкавання 600-гадовага юбілею — распрацоўка турыстычных маршрутаў. Месцічы запэўніваюць, што прырода Моўчадзі — гэта адлюстраванне легендарнай беларускай прыгажосці. Але паколькі вёска знаходзіцца далёка ад раённага цэнтра, жыхароў з кожным годам становіцца ўсё менш. І гэта нягледзячы на наяўнасць інфраструктуры — школы, крамы, бальніцы, Дома культуры.

«Моладзь заклапочаная не столькі асэнсаваннем таго, што было, колькі прадчуваннем таго, што будзе. І вельмі актуальна і сімвалічна ў Год народнага адзінства адчуваць сябе часцінкай дарагой і любімай малой радзімы», — упэўнены баранавіцкі **гісторык і краязнавец Аляксандр ЖУК**, адзін з ініцыятараў маштабнага святкавання юбілею Моўчадзі.

І нават пакуль у вёсцы няма трасы для маўцінбайку, а да афіцыйнага юбілею яшчэ год, пазнаёміцца з Моўчаддзю варта. «Адзначу адну парадаксальную і шчаслівую рэч. У нашых вёсках ужо амаль няма старажытнага вясковага каларыту. А вось у мястэчках Моўчадзь, Ішкалдзь, што побач, нейкая асаблівая атмасфера, якая паглыбіле ў стагоддзі. Мы цяпер усё руйнуем, спрабуем навесці парадак. І многае разбураецца ў гісторыі. Цэнтр Моўчадзі не зруйнаваны, у XVIII-XIX стагоддзях ён быў забудаваны яўрэйскімі дамамі і крамамі, якія засталіся і да сёння. На вясковых вуліцах засталася шчыльная старажытная забудова, як у еўрапейскіх гарадах. У вёсцы захоўваецца каларыт старажытнага паселішча, яго планіроўка», — расказвае Васіль Дубейка. Гісторык называе Моўчадзь своеасаблівым этнаграфічным музеем пад адкрытым небам. Але ва ўсёй непаўторнасці Моўчадзь раскрываецца таму, хто ведае яе гісторыю, папярэджвае Васіль Міхайлавіч: «Вельмі добра, што людзі вандруюць па Беларусі. І Моўчадзь — тое паселішча, дзе можна ўбачыць шмат цікавага, калі, вядома, трошкі ведаць гісторыю. Калі чалавек не ведае гісторыі, ён не можа ўбачыць усяго каларыту і расшыфраваць гістарычны код. Каб адчуць сябе нашчадкам вялікай гісторыі, трэба знайсці ў сабе пэўны ключык».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

## А вы ведалі?

### Карысць і небяспека актываванага вугалю

# Сапраўды бясшкодны?

**Актываваны вугаль вядомы сваімі адсарбіруючымі ўласцівасцямі — ён здольны паглынаць таксіны. У сувязі з гэтым ён выкарыстоўваўся паўсюдна: пры алкагольных атручэннях, метэарызме, для ачышчэння скуры. Аднак не варта забываць, што актываваны вугаль — перш за ўсё лекі, а прыём яго ў вялікіх колькасцях можа нанесці шкоду арганізму. Расійскае Міністэрства аховы здароўя нядаўна ўвогуле выкрасліла яго са спіса жыццёва важных прэпаратаў. Дык ці патрэбен ён у нашых аптэчках? Або разрэкламаваныя ўласцівасці такіх таблетак і дабавак — гэта толькі чорны піяр?**

Многія лічаць, што актываваны вугаль можа справіцца з любой праблемай: ад млоснасці да алергіі. Але такі імідж, тлумачаць эксперты, замацаваўся з-за дэфіцыту лекаў у савецкіх аптэках.

Найперш вывядзенне таксінаў — гэта наймагутнейшы маркетынгавы трыгер, і пра тое, як дзейнічаюць сарбенты, не ўсе ведаюць, наракаюць гастраэнтэролагі. Сарбент праходзіць праз арганізм, адначасова збіраючы ўсё, што можа да яго прыліпнуць. У выпадку рэальнага атручэння ён дапаможа толькі на працягу першай гадзіны і зусім не дапаможа пры алкагольнай інтаксікацыі. Калі алкаголь і прадукты яго распаду трапілі ў печань, а адтуль у мозг, з-за чаго мы і адчуваем усе непрыемныя наступствы, няма сэнсу чысціць кішэчнік — алкаголь адтуль сышоў. І ўжываць актываваны вугаль, прынамсі, бессэнсоўна.



Да таго ж вугаль зацягвае ў свае поры яшчэ і карысныя бактэрыі з ферментамі, вітамінамі і мікраэлементамі. Напрыклад, ён можа прыбраць вітамін А з морквы, кальцый са з'едзенага на сняданак тварагу або вітамін С.

Трэба таксама памятаць, што сарбент нельга прымаць адначасова з іншымі лекавымі рэчывамі. Паміж прыёмам сарбентаў і лекаў павінен прайсці нейкі істотны прамежак часу: гадзіна-дзве ці нават больш.

У Каралеўскім каледжы Лондана высветлілі, што лішкі актываванага вугалю, які некаторыя бескантрольна ўжываюць для нібыта ачышчэння скуры і ўсяго арганізма, успрымаюцца апошнім як канцэрагены і пасля могуць справакаваць анкалагічнае захворванне. Адна з рызык прыёму актываванага вугалю заключаецца ў тым, што ён уплывае на дзеянне жыццёва важных лекаў і на засваенне пажыўных рэчываў. Часты прыём вугалю можа справакаваць узнікненне млоснасці, запораў, язвы, а гэта ў выніку можа прывесці да анкалогіі органаў стрававальна-кішачнага тракта.

## Добрыя парады

# Прыстанішча для мікробаў

**Як часта трэба мяняць бытавыя прылады, напрыклад, губку для мыцця посуду, мачалку для душу, брытву для галення, зубную шчотку і расчоску? Іх тэрміны прыдатнасці, як пішуць еўрапейскія газеты, нашмат ніжэйшыя, чым мы ўяўляем.**



Па даных замежных СМІ, пасля толькі аднаго тыдня выкарыстання ў губцы для посуду апынаецца 50 мільярдаў бактэрый. І нават калі губку пракіпяціць, загінуць далёка не ўсе. Гэта датчыцца і зубных шчотак. Пішуць, што калі своечасова іх не памяняць, яны пачынаюць памнажаць болькі ў роце. Ці так гэта?

Губка для мыцця посуду праз два тыдні выкарыстання яшчэ не пачынае непрыемна пахнуць ці падазрона выглядаць. Аднак мікрабіёлагі знаходзяць на ёй цэлыя калоніі мікробаў. У сувязі з гэтым варта памятаць, што звычайныя сродкі для мыцця посуду, насуперак распаўсюджанай думцы, талеркі з лыжкамі зусім не дэзынфіцыруюць і не забіваюць мікраарганізмы, а толькі здымаюць паверхневы слой, дазваляючы тлушчу працей аддзяляцца ад посуду. Гэта значыць, мыйныя сродкі толькі змываюць. Але калі бактэрыі размнажаюцца ўнутры губкі, яны лёгка распаўсюджваюцца на абедзенны стол, відэльцы, нажы і ўвесь посуд.

Дэрматолагі адзначаюць, што падчас выкарыстання ў поры мачалкі для душу забіваюцца амярцвелыя часцінкі скуры. А чалавечая скура — гэта пажыва для грыбоў і бактэрый, якія, распладзіўшыся, атакуюць і самога ўладальніка мачалкі. Грыбок і цвіль — крыніца ў тым ліку праяў алергічных рэакцый.

Прылада для галення праз паўтара месяца выкарыстання стане, хутчэй за ўсё, не вельмі зручная. Аднак каляровая палоска-індыкатар, якая, паводле інструкцыі вытворцы, павінна пабялець і гэтым прасігналізаваць, што станок пара замяніць, застанецца ўсё такая ж яркая. Пры гэтым лёзы ў станках так замацаваны, што з часам паміж імі збіраюцца рэшткі скуры і валасоў. Яны зноў становяцца ежай для мікробаў, як у выпадку з губкай і мачалкай. Плюс скура атрымлівае мільёны драпін і буйнейшыя парэзы.

Урачы раяць мыць грабеньчыкі і шчоткі для валасоў хоць бы раз на тыдзень і па магчымасці мяняць кожныя паўгода. А вось астатнія прадметы не адмыеш ад мікробаў. Таму губку для посуду раяць выкарыстоўваць максімум два тыдні, брытву для галення абнаўляць праз месяц, а зубной шчоткай карыстацца не даўжэй за тры месяцы.



# ЗРАЗУМЕЦЬ І АДАГРЭЦЬ

## Як распазнаць суіцыдальныя схільнасці ў блізкага чалавека

**Па шкале Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Беларусь апошнім часам адносілася да краін з сярэднім узроўнем распаўсюджанасці суіцыдаў. Упершыню за ўсю гісторыю афіцыйнай рэгістрацыі ў 2014 годзе ўзровень самагубстваў у нашай краіне стаў меншы, чым 20 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва —18,4. Аднак такая пазітыўная дынаміка захоўвалася нядоўга. Рост колькасці самагубстваў пачаў назірацца з 2016 года — 21,5, 2017 г. — 20,7, 2018 г. — 18,5, 2019 г. — 17,9, 2020 г. — 26,2. Чаму так адбываецца? Што прымушае нашых суграмадзян зводзіць рахункі з жыццём? Як распазнаць патэнцыяльнага самазабойцу і прадухіліць трагедыю? З гэтымі пытаннямі напярэдадні Сусветнага дня папярэджання самагубстваў, які адзначаецца 10 верасня, мы звярнуліся да спецыялістаў Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера.**

### У ЛІДАРАХ ПА СУІЦЫДАХ — РАЗВІТЫЯ КРАІНЫ

Суіцыды застаюцца актуальнымі для большасці краін свету, яны складаюць 50 % усіх гвалтоўных смерцяў у мужчын і 71 % — у жанчын. Самагубствы найбольш характэрныя для ўзросту 45 гадоў і старэйшага, а сярод маладых людзей 15-29 гадоў яны з'яўляюцца другой вядучай прычынай смерці. У групу павышанай рызыкі трапляюць людзі сталага ўзросту і падлеткі.

Па даных СААЗ, агульная колькасць смерцяў ад суіцыду ў свеце сёння набліжаецца да мільёна ў год. Пры гэтым у выніку самагубстваў людзей памірае больш, чым у выніку войнаў і гвалтоўных забойстваў, разам узятых. Па распаўсюджанасці выпадкаў суіцыду лідзіруюць развітыя краіны. Прычым першынство належыць Усходняй Еўропе. У Японіі штогод канчае самагубствам прыкладна 30 тысяч чалавек. Найменшыя ж паказчыкі — у Лацінскай Амерыцы і ісламскіх краінах. Лічыцца, што сусветным «лідарам» па самазабойствах з'яўляюцца шведы, хоць яны ж і адны з самых багатых людзей на планеце. Гэта сведчыць аб тым, што суіцыд — зло, ад якога мы не пазбавімся, нават калі будзем жыць, як шведы.

Але пры гэтым заўважана, што чым больш негатыўна людзі ацэньваюць свае эканамічныя перспектывы, тым вышэйшая верагоднасць самагубства. Даныя сведчаць аб тым, што сярэдні ўзровень самагубстваў значна павялічыўся пасля фінансавага крызісу ва ўсіх полаўзроставых групах, аднак гэты эфект аказаўся больш выяўлены ў жанчын, чым у мужчын.

### НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЗНАКІ

— Самагубства — выключна чалавечы акт. Чалавек, які адважыўся на падобны крок, адчувае глыбокае гора, моцны душэўны боль, частае пачуццё немагчымасці справіцца са сваімі праблемамі. Завершаны суіцыд немагчыма выправіць, аднак яго можна прадухіліць, галоўнае, трэба быць уважлівымі да навакольных. Існуюць арыенціровачныя «ключы», якія паказваюць на магчымасць суіцыдальнай актыўнасці, — тлумачыць **урач-псіхіятр-нарколаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля ГРАЧЫШЫНА.**

Такімі знакамі суіцыдальнай рызыкі з'яўляюцца як прамыя пагрозы «Я збіраюся пакончыць з сабой», «На наступным тыдні мяне ўжо не будзе жывога», так і ўскосныя: «Без мяне жыццё горшае не будзе» або «Часам хочацца з усім гэтым скончыць раз і назаўжды». Таксама характэрныя нечаканыя змены настрою. Павінны насцярожыць нядаўняя цяжкая страта, раздача любімых рэчаў, навядзенне парадку ў справах, вяртанне даўгоў, страта самапавагі, самаізаляцыя.

Пры ўзнікненні нават найменшага падазрэння аб магчымасці суіцыду альбо наяўнасці цяжкіх асабістых праблем не пакідайце чалавека аднаго. Самае лепшае — звярнуцца па дапамогу да спецыяліста — псіхолага, псіхатэрапеўта, псіхіятра-нарколага, дзе акажуць своечасовую кваліфікаваную дапамогу.

— Непасрэдныя прычыны суіцыду звычайна цесна звязаныя з праблемамі ў найбліжэйшым атачэнні: асабіста-сямейныя канфлікты, стан псіхічнага і фізічнага здароўя, канфлікты як вынік антысацыяльных паводзін, праблем у прафесійнай або вучэбнай сферы, матэрыяльна-бытавыя і фінансавыя цяжкасці, — кажа **псіхолаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Аксана НЕХВЯДОВІЧ.** — Карэлююць з суіцыдальнымі рызыкамі і такія фактары, як узрост 45 гадоў і старэйшы, алкагалізм, узбуджэнне, гвалт і агрэсія ў паводзінах, суіцыдальныя паводзіны ў мінулым, мужчынскі пол, нежаданне прымаць дапамогу, зацяжное праходжанне прыступу дэпрэсіі, шпіталізацыя і лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары, страта блізкага чалавека або развод у нядаўнім мінулым, цяжкае саматычнае захворванне, страта работы, выхад на пенсію, адзінота, страта жонкі ці мужа.

### КРЫНІЦЫ ПАДТРЫМКІ

Важную ролю ў прадухіленні суіцыду адыгрываюць даступныя крыніцы падтрымкі, кажа **ўрач-псіхіятр-нарколаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Аксана БУЙКО.** Гэта сям'я, сябры, калегі па рабоце, святары, крызісныя цэнтры, медыцынскія работнікі. Усе наяўныя рэсурсы неабходна выкарыстоўваць. Нават калі чалавек з суіцыдальным настроем супраць, варта паспрабаваць знайсці каго-небудзь, хто праявіў бы да яго асаблівае спачуванне.

— Пераважная большасць жадае не смерці, а вызвалення ад псіхічнага болю, — дадае Наталля Грачышына. — Большасць людзей, якія абдумваюць магчымасць самагубства, хоча, каб іх пакуты скончыліся, і яны імкнуцца знайсці альтэрнатыву або шлях аблягчэння болю.

Каб «суіцыдальны» чалавек не адчуў крыўды ці адсутнасці клопату пры звароце да спецыялістаў, варта пагутарыць з ім загадзя, растлумачыўшы, што часам бывае лягчэй гаварыць з чужым чалавекам, чым з блізкім. Пры гэтым размаўляць трэба, імкнучыся не абвінавачваць яго ні ў чым і не выклікаючы ў яго пачуцця віны.

**Па даных СААЗ, агульная колькасць смерцяў ад суіцыду ў свеце сёння набліжаецца да мільёна ў год. Пры гэтым у выніку самагубстваў людзей памірае больш, чым у выніку войнаў і гвалтоўных забойстваў, разам узятых.**

У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры псіхічнага здароўя адкрыты два стацыянарныя псіханеўралагічныя аддзяленні для лячэння крызісных станаў. У краіне функцыянуюць бясплатныя тэлефонныя «гарачыя лініі» для аказання экстраннай псіхалагічнай дапамогі людзям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю. Яны працуюць не толькі ў Мінску (пры ўстановах аховы здароўя «Гарадскі клінічны дзіцячы псіхіятрычны дыспансер» г. Мінска — 317-89-30 , «Гарадскі клінічны псіхіятрычны дыспансер» г. Мінска — 373-31-72), але і ва ўсіх абласцях (інфармацыя аб нумарах тэлефонаў маецца на сайце Міністэрства аховы здароўя www.minzdrav.gov.by).

Тэндэнцыі

# Асяроддзе, даступнае для ўсіх

## Новы трэнд у грамадстве пашырае магчымасці

**На выкананне мерапрыемстваў у падпраграме «Даступнае асяроддзе. Жыццядзейнасць інвалідаў і фізічна аслабленых асоб» дзяржпраграмы «Сацыяльная абарона» запланавана ўкласці больш за Br300 мільёнаў рублёў.**

«Пытанні сацыяльнай палітыкі ў дачыненні да людзей з інваліднасцю заўсёды былі і застаюцца актуальнымі для грамадства. У Беларусі каля 6 % насельніцтва — людзі з інваліднасцю. Гэта немалая лічба, за якой стаяць рэальныя лёсы. Мы абавязаны стварыць такія ўмовы, каб жыццё ў гэтых людзей было камфортным. Праекты ў гэтым кірунку рэалізоўваюцца ў нашай краіне з 2007 года ў рамках дзяржпраграм. Да нядаўняга часу даступнае асяроддзе асацыявалася перш за ўсё са з'яўленнем поручняў і пандусаў, шырокіх дзвярэй. Але сёння гэтага недастаткова. Задача на найбліжэйшую пяцігодку — павялічыць колькасць аб'ектаў, якія будуць не часткова даступнымі, а цалкам камфортнымі для знаходжання ўсіх людзей», — сказала **кансультант упраўлення па справах інвалідаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КАПУРА.**

Для гэтага і была распрацавана і зацверджана падпраграма «Даступнае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб» дзяржпраграмы «Сацыяльная абарона». Мэта яе — забяспечыць даступнае асяроддзе з улікам комплекснага падыходу. Гэта азначае забеспячэнне аб'ектаў не толькі пандусамі, але і падлогавай тактыльнай пліткай, універсальнымі таблічкамі са шрыфтам Брайля на будынках, маўленчымі інфарматарамі, мнемасхемамі, кантраснымі маркіроўкамі шкляных дзвярэй і дзвярных ручак, уладкаванымі ліфтамі і санвузламі, парковачнымі месцамі для асабістага транспарту людзей з інваліднасцю, зручным грамадскім транспартам (з паніжанай падлогай, з інфармацыйным табло і галасавымі абвесткамі), поўным уладкаваннем прылеглай да аб'ектаў тэрыторыі, каб інваліды маглі беспрашкодна перамяшчацца як унутры будынкаў, так і паміж імі.

Святлана Капура прывяла прыклады цалкам даступных, па-сапраўднаму камфортных для ўсіх і прадуманых да дробязяў аб'ектаў: будынак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, аўтавакзал у Брэсце, Нацыянальны аэрапорт і Мазырскі драматычны тэатр імя Івана Мележа.

«Да 2025 года нам неабходна павялічыць колькасць даступных для ўсіх грамадзян аб'ектаў да 23 %. Самае асноўнае пры гэтым — што дадзеную работу нам трэба выконваць у міжведамасным узаемадзеянні, у тым ліку прыцягваючы грамадскія аб'яднанні», — сказала Святлана Капура.



**Намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксей АНАНІЧ** адзначыў, што ўжо з мая ў Беларусі пачалі дзейнічаць будаўнічыя нормы «Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб», якія прымяняюцца пры праектаванні даступнага асяроддзя, будынкаў рознага прызначэння і агульнадаступных адкрытых тэрыторый з улікам прынцыпаў універсальнага дызайну. Важна тое, што гэтыя патрабаванні цяпер трэба абавязкова выконваць. Аляксей Ананіч растлумачыў, што пад фізічна аслабленымі асобамі маюцца на ўвазе не толькі інваліды. Гэта велізарная доля насельніцтва: часова маламабільныя (напрыклад, з-за хваробы, траўмы), цяжарныя, жанчыны з малымі на руках або ў калясках, дзеці дашкольнага ўзросту, састарэлыя грамадзяне.

«Сёння ўжо будуюцца аб'екты, якія адпавядаюць усім новым нарматыўным патрабаванням, прынятым у Міністэрстве для стварэння безбар'ернага асяроддзя, — дадаў намеснік міністра. — Забудоўшчыкі гатовыя ісці за новым трэндам у грамадстве — рабіць асяроддзе пражывання даступным для ўсіх катэгорый грамадзян».

Праўда, па ўжо існуючых аб'ектах праблема застаецца. Справа ў тым, што не ўсе аб'екты могуць быць мадэрнізаваны і рэканструяваны з забеспячэннем патрабаванняў безбар'ернага асяроддзя.

«Асабліва гэта датычыцца жылых будынкаў, — сказаў Аляксей Ананіч. — Мы распрацавалі альбом-схему варыянтаў забеспячэння доступу ў такія аб'екты і размясцілі яго на сайце міністэрства. Але кожны аб'ект унікальны, і падыход патрэбен індывідуальны, універсальнага рашэння няма. Хочацца адзначыць, што за апошні год колькасць зваротаў да нас аб адступленні ад патрабаванняў нарматыўна-прававых актаў, якое дазволіла б фізічна аслабленым асобам трапляць у свае жылыя будынкі без перашкод, узрасла. Гэта значыць, стала больш праекціроўшчыкаў, заказчыкаў, якія глыбока прапрацоўваюць кожнае рашэнне».

Пры карэкціроўцы будаўнічых нормаў улічваецца жыццёвая практыка. Так, міністэрства сумесна з таварыствам інвалідаў прааналізавала сітуацыю, звязаную з пад'ёмнікамі, і прапрацавала магчымасць замяніць іх на пандусы, бо практыка паказала, што выкарыстоўваюцца пад'ёмнікі не паўсюдна.

«Таму ўстанавілі патрабаванне: абавязкова выкарыстоўваць на перападах вышынь на ўваходах у будынкі пандусы, і толькі калі гэта немагчыма — пад'ёмнікі», — сказаў Аляксей Ананіч.

Таксама пасля аналізу аб'ектаў, якія ўжо будуюцца, міністэрствам былі зменены будаўнічыя нормы па жылых і грамадскіх будынках.

«Зацвердзілі патрабаванне аб тым, што неабходна забяспечваць уваход з нулявой адзнакі зямлі. Гэта значыць, ганак там, дзе магчыма, уладкоўваць не будзе. Тады фізічна аслабленыя асобы будуць мець больш просты доступ у будынкі», — растлумачыў Аляксей Ананіч.

Ён падкрэсліў: усе змены ўвязваюцца з магчымасцямі будаўнічай галіны. Перш чым прымаць нейкія рашэнні, аналізуюцца магчымасці вырабляць патрэбную прадукцыю, выконваць неабходныя работы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

**Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ:**

— Мінск працягвае адаптацыю сацыяльнай інфраструктуры ў адпаведнасці з новымі падыходамі і правіламі. Развіваецца сістэма аказання паслуг асобам з абмежаванымі магчымасцямі, а гэта ўжо не толькі пра адаптаванае навакольнае асяроддзе, гэта больш аб прыняцці грамадствам асоб з абмежаванымі магчымасцямі, павагу да іх і ўменне аказваць ім садзейнічанне. Для гэтага мы рэгулярна праводзім навучанне персаналу арганізацый, аб'ектаў гандлю і бытавога абслугоўвання.

Першачарговай задачай у Мінску на найбліжэйшы час стане поўная адаптацыя адміністрацыйных будынкаў пад існуючыя нормы стварэння безбар'ернага асяроддзя, каб у людзей не ўзнікала праблем з доступам да дзяржаўных паслуг у мясцовых органах улады, а таксама да паслуг ва ўстановах аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, установах сацыяльнай абароны, у аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання і гасцініцах. Гэта вялікі аб'ём работы, які нам трэба будзе зрабіць у найбліжэйшую пяцігодку, каб прыярытэтныя аб'екты жыццядзейнасці Мінска былі даступныя для ўсіх груп насельніцтва.

По дарозе



# СПАДЧЫНА ПАЛЕССЯ, або Экспазіцыя без шкла

**Пінск можа стаць адным з пунктаў разнастайных турыстычных маршрутаў. Напрыклад, па дарозе да яго можна пабываць у заказніках, прайсціся экалагічнымі сцежкамі, наведаць старажытныя паркі Парэчча, Дубое, Сташаны, паназіраць, як вырошчваюць і збіраюць ягады на прадпрыемстве «Палескія журавіны», даведацца, як працуюць шлюзавыя камеры на гідравузле «Дубой», ці здзейсніць пераправу праз раку Піну, прычым тут усё выконваецца ўручную, можна нават паспрабаваць свае сілы ў перацягванні парома пры дапамозе спецыяльнага драўлянага прыстасавання — палкі-гамаркі.**

А яшчэ Піншчына вяртае тое, што, на жаль, сёння страчана ў гарадскім асяроддзі — традыцыі, рамёствы, абрады, веды і эмоцыі, з імі звязаныя. З мэтай захавання этнаграфічнай памяці, у вёсцы Мерчыцы быў створаны Цэнтр традыцыйнай культуры «Спадчына Палесся». Тут можна выпрабаваць сябе за ткацкім станком, паўдзельнічаць у танцавальных майстар-класах ці навучыцца гуляць у народныя гульні. У шасці залах музея сабрана больш за 200 экспанатаў, якія распавядаюць пра побыт палешукоў. «Нашы экспазіцыі не маюць шкла. Мы спецыяльна рабілі цэнтр такім, каб людзі тут маглі акунуцца ў побыт, адчуваць сябе так, быццам знаходзяцца ў сапраўднай вясковай хаце, маглі дакрануцца да прадметаў, вярнуцца да вытокаў, адчуць сваю сувязь з папярэднікамі», — падзялілася **загадчык Мерчыцкага цэнтра традыцыйнай культуры і побыту Таццяна ВАКУЛІЧ.** Усе госці цэнтра становяцца сапраўднымі ўдзельнікамі старадаўніх традыцый: удзельнічаюць у Калядках, спальваюць чучала і водзяць карагоды на Масленіцу, качаюцца ў расе і просяць у Бога здароўя на Юр'е, частуюцца напоем на зёлках, тут жа сабраных... У час пандэміі тут апрабавалі сямейныя экскурсіі. На народныя святы можна дамовіцца, і вашым дзеткам арганізуюць сапраўдныя палескія прыгоды.

Падобныя цэнтры на Палессі развіваюцца, і ў супрацоўніцтве з мясцовымі рамеснікамі, фальклорнымі калектывамі яны здольныя прыдумаць праграмы пад самых розных гасцей — ад малога да вялікага.

Асаблівасць Піншчыны ў тым, што гарадскія і раённыя ўлады разам працуюць на развіццё турыстычнай прывабнасці рэгіёна. **Намеснік старшыні раённага выканкама Дзмітрый ПАЛХОЎСКІ** адзначыў, што сёння тут стараюцца развіваць розныя віды адпачынку: гэта і гістарычныя вандроўкі, агратурызм, экалагічны, веласіпедны, медыцынскі, водны (сплавы па Прыпяці і прагулкі на цеплаходзе). Тут можна запускаць і аграпрамысловы турызм: у раёне рэканструявалі малочнатаварныя комплексы, дзе можна паглядзець новыя тэхналогіі вытворчасці малака і мяса. Ёсць задумкі новых камбінаваных маршрутаў з коннымі паходамі, экскурсіяй па Пінску і катаннем на цеплаходзе.

**Загадчык сектара турызму ўпраўлення спорту і турызму Брэсцкага абласнога выканкама Дзяніс НІКІЦЮК** упэўнены, што Палессе неабходна прасоўваць як адзіны турыстычны рэгіён і стаўку рабіць на неаднадзённыя, насычаныя наведваннем розных пунктаў маршруты. Прычым турыстычныя вандроўкі, якія вядуць у Пінск, могуць праходзіць не толькі праз Пінскі, але і праз Драгічынскі, Іванаўскі раёны, дзе ўжо створаны цікавыя аб'екты. Пазней плануецца далучыць сюды Лунінецкі і Столінскі раёны. На жаль, сёння праблема ўпіраецца ў недахоп аб'ектаў размяшчэння, і нават аграсядзібы не здольныя закрыць праблему з рассяленнем турыстаў на начлег. Адна справа — калі госці прыязджаюць на сваіх машынах сем'ямі, іншая — калі вялікія патокі турыстаў вязуць аўтобусамі. Важна фарміраванне сістэмы кіравання падобнымі праектамі і інфармацыйнага забеспячэння новага прадукту. На Піншчыне плануецца стварыць адзіны інфармацыйны цэнтр.

Будучыня і за турыстычнымі кластарамі, калі розныя аб'екты (сядзібы, лясгасы, турпрадпрыемствы, мясцовыя творчыя калектывы, музеі) працуюць на стварэнне адзінага прывабнага прадукту, які забяспечыць гасцей адкрыццямі, уражаннямі, забавамі і дазволіць затрымаць іх на больш працяглы час.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



# АБНАЎЛЕННЕ ФОРМЫ І ЗМЕСТУ

**Кніга — крыніца ведаў, дзверы да новых сюжэтаў, знаёмстваў па-за часам і без межаў. І па традыцыі напярэдадні новага вучэбнага года і Дня беларускага пісьменства айчынныя выдавецтвы радуюць нас новымі выданнямі рознай тэматыкі і прызначэння. Так, напрыклад, сёлета на ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа» выдадзена каля 1,8 мільёна падручнікаў.**



— У 2021/2022 вучэбным годзе мы завяршаем працэс абнаўлення зместу агульнай і вышэйшай адукацыі — уводам у адукацыйны працэс абноўленых падручнікаў і абноўленых вучэбных дапаможнікаў для 11 класа. Пры іх падрыхтоўцы мы цесна супрацоўнічалі з вядучымі выдавецтвамі краіны — «Адукацыяй і выхаваннем», «Народнай асветай», «Вышэйшай школай», «Беларускай энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі», Выдавецкім цэнтрам БДУ. І я вельмі рада, што маю магчымасць падзякаваць ім за сумесны плён. У выніку працы аўтарскіх калектываў, супрацоўнікаў выдавецтваў, паліграфічных прадпрыемстваў, спецыялістаў Нацыянальнага інстытута адукацыі, супрацоўнікаў Міністэрства адукацыі атрымаліся, на наш погляд, вельмі цікавыя і сучасныя выданні, якія парадуюць і зместам, і паліграфічным выкананнем. «Новыя вучэбныя дапаможнікі дазваляюць фарміраваць у вучняў так званую кампетэнцыю XXI стагоддзя, — адзначыла **намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Людміла РАМАНОЎСКАЯ.** — У сучасным інфармацыйным грамадстве вельмі важна ўдасканальваць навігацыйную функцыю вучэбнага дапаможніка, і ў гэтым нас таксама падтрымалі супрацоўнікі выдавецтваў. Вучэбныя дапаможнікі сканструяваны такім чынам, каб вучань у працэсе падрыхтоўкі мог звяртацца да розных кампанентаў: атласаў, контурных карт, зборнікаў задач і г. д. Наш падручнік сёння — гэта навігатар у інфармацыйным полі, і ён дае магчымасць лёгка сарыентавацца ў разнастайных медыярэсурсах.

Да новых вучэбных дапаможнікаў па замежных мовах распрацаваны электронны дадатак, які ўтрымлівае аўдыяфайлы, фанетычныя практыкаванні, базу інтэрнэт-заданняў. Гэтыя электронныя дадаткі размешчаны на профілі lingvo.adu.by. Дадзены рэсурс распрацаваны сумесна з выдавецтвам «Вышэйшая школа» замест ужо нязручных для выкарыстання CD-дыскаў.

Пры распрацоўцы новых падручнікаў шмат увагі ўдзялялася павышэнню якасці візуалізацыі вучэбнага матэрыялу. Павялічана колькасць ілюстрацый, шмат дадатковых матэрыялаў, даступных праз QR-коды. У выніку супрацоўніцтва Нацыянальнага інстытута адукацыі з вядучымі выдавецтвамі вучэбны працэс сёння ва ўстановах дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай і вышэйшай адукацыі забяспечваюць вучэбныя выданні, якія маюць высокую адзнаку ў тым ліку і ў рамках рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

**«Наш падручнік сёння — гэта навігатар у інфармацыйным полі, і ён дае магчымасць лёгка сарыентавацца ў разнастайных медыярэсурсах».**

Да вучэбнага года падрыхтаваны і новы нацыянальны буквар, які прэзентуюць 3 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Як адзначаюць стваральнікі, у ім таксама прысутнічаюць цікавыя функцыі, якія дазволяць дзецям выкарыстоўваць дадатковыя медыярэсурсы. У прыватнасці, будзе магчымы прагляд анімацыйных фільмаў, створаных кінастудыяй «Беларусьфільм».

Калі ж звярнуцца да аналізу прапаноў вучэбнай і мастацкай літаратуры, якія падрыхтавалі напярэдадні новага вучэбнага года беларускія выдавецтвы, то палітра атрымліваецца на любы густ і запыт. У «Народнай асвеце», дзе ўжо 70 гадоў выдаюць вучэбныя дапаможнікі, а 25 з іх рыхтуюць падручнікі шрыфтам па сістэме Брайля, у гэтым годзе прапаноўваюць больш чым 30 найменняў дапаможнікаў.

— Вучэбныя дадаткі мы выпускаем сумесна з Нацыянальным інстытутам адукацыі. Усе пытанні, што ўзнікаюць у рабоце, мы заўсёды вырашаем сумесна. «Народная асвета» сёлета падрыхтавала (і праца яшчэ працягваецца) вучэбныя дапаможнікі 34 найменняў. З іх 12 вучэбных дапаможнікаў для агульнаадукацыйнай школы (тыраж склаў 719 643 экзэмпляры), 17 вучэбных дапаможнікаў для спецыяльных школ (19 361 экзэмпляр), 4 вучэбныя дапаможнікі ў 30 кнігах шрыфтам па сістэме Брайля (838 экзэмпляраў), — распавяла **дырэктар выдавецтва Вікторыя КАЛІСТРАТАВА.** — А таксама шэраг вучэбна-метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў і 21 найменне для школьнай бібліятэкі шрыфтам па сістэме Брайля. Гэта ўсё ажыццяўляецца адпаведна з дзяржаўнай праграмай «Аб сацыяльнай абароне» да 2030 года. Упершыню ў гэтым годзе дзяржава прафінансавала выданне такой колькасці мастацкай літаратуры для дзяцей з парушэннямі зроку. Акрамя вучэбных дадаткаў для агульнаадукацыйнай школы, мы таксама выдаём падручнікі для спецыяльных школ. Для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця нядаўна атрымалі з друкарні «Матэматыку» з рабочым сшыткам для 1 класа, «Элементы камп'ютарнай граматы». Такія напрацоўкі выклікаюць зацікаўленасць у нашых калег з краін СНД, дзе нашы падручнікі карыстаюцца аўтарытэтам.

Асноўны кірунак дзейнасці выдавецтва **«Вышэйшая школа»** — падрыхтоўка выдання вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў. Сёлета тут, як распавёў **дырэктар установы Аляксандр НЯЧАЙ,** быў запланаваны выпуск 11 вучэбных дапаможнікаў агульным тыражом прыкладна 250 тысяч экзэмпляраў па замежных мовах. Сем падручнікаў ужо выпушчаны, тры будуць гатовыя да канца жніўня, а другая частка падручніка «Англійская мова. 10 клас» убачыць свет у снежні, паколькі навучанне па ім пачнецца толькі ў трэцяй чвэрці ў студзені наступнага года. З шэрагу дадатковай літаратуры можна вылучыць, напрыклад, кнігу «Беларускі фальклор» з серыі «Бібліятэка школьніка». Асаблівасць яе заключаецца ў тым, што ўсе размешчаныя тут творы маюць QR-коды і дазваляюць праслухаць іх. І выданне можа быць карысным не толькі школьнікам, але і ўсім, хто цікавіцца беларускай літаратурай і культурай.

У выдавецтва **«Адукацыя і выхаванне»** таксама вельмі разнастайны асартымент. У іх прайс-лісце 747 пазіцый, дзе, вядома, вучэбная літаратура, дапаможнікі, працоўныя сшыткі. Што датычыцца мастацкай літаратуры, то і тут ёсць цікавыя прапановы: кнігі «Фанечка. Мандарынавая гісторыя» Аксаны Аракчэевай, «Я тут жыву» Уладзіміра Ліпскага. Для пашырэння кругагляду добрымі крыніцамі стануць выданні «99 знакамітых мясцін Беларусі», «Беларускія жанчыны, якія апярэдзілі час», серыя пра князёў Вялікага Княства Літоўскага, серыя «Свет вандровак».

**Алена ДРАПКО.**

# Падарунак ад беларускага народа і Прэзідэнта Беларусі

## У Варонежскай вобласці адкрылі новую школу

**Новую школу на 520 месцаў, пабудаваную беларускімі спецыялістамі, адкрылі ўчора ў пасёлку Стрэліца Сямілукскага раёна Варонежскай вобласці, перадае карэспандэнт БелТА з цырымоніі яе адкрыцця.**

Урачыстасць стала знакавай падзеяй, пра што сведчыў хоць бы састаў яго ўдзельнікаў: віцэ-спікер Дзярждумы Расіі Аляксей Гардзееў, пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір Сямашка, губернатар Варонежскай вобласці Аляксандр Гусеў. «Гэтая школа — сапраўдны падарунак ад беларускага народа, Прэзідэнта і ўрада Беларусі, — сказаў Аляксей Гардзееў. — Выкарысталі беларускі крэдыт і беларускія магутнасці — пабудавана сапраўдная прыгажуня-школа».

А каб тэрыторыя вакол школы была заўсёды дагледжаная, па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі **старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл РУСЫ** перадаў у дар навучэнцам трактар Belarus, аснашчаны ўсім неабходным камунальным абсталяваннем.

«Выдатны аб'ект, зроблена ўсё з душой і якасна, — пахваліў генеральнага падрадчыка «Будаўнічы трэст № 12» Магілёва **губернатар Аляксандр ГУСЕЎ.** — У ім неўзабаве з'явіцца адзін важны элемент — музей беларуска-расійскай дружбы. І гэтую дружбу не змогуць разбурыць ніякія нягоды».



**Пасол Уладзімір СЯМАШКА,** павіншаваўшы мясцовых жыхароў з новай школай, адзначыў, што яна пабудавана ў рэкордныя тэрміны — менш чым за год. Ён паабяцаў, што беларускі бок узвядзе ў рэгіёне яшчэ не адзін такі аб'ект. Пацвярджэннем яго слоў стала яшчэ адна цырымонія, якая адбылася ўчора ж: члены беларускай дэлегацыі залажылі памятны знак на месцы будаўніцтва новай школы ў райцэнтры Сямілукі.

Адукацыйную ўстанову ў Стрэліцы не толькі пабудавалі беларусы: яго прафінансавала крэдытнымі рэсурсамі ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь». Такая схема стала выгаднай абодвум бакам. Расіяне атрымалі стабільнае фінансаванне і двухгадовую адтэрміноўку плацяжоў, а таксама высокую якасць работ за прымальны кошт. Выгада ж беларускага боку ў тым, што выданы ёю крэдыт з'яўляецца звязаным шэрагам умоў: абавязковым удзелам у будаўніцтве беларускіх кампаній, якія атрымаюць свой прыбытак, пастаўкамі беларускіх будматэрыялаў і абсталявання.

Плануецца, што падобная схема будзе прымяняцца і пры будаўніцтве іншых сацыяльных аб'ектаў з беларускім удзелам у Варонежскай вобласці.

Акцыя

# «Няхай школа падорыць веды і верных сяброў»

## Памочнік Прэзідэнта Мікалай РАГАШЧУК павіншаваў дзяцей са шматдзетнай сям'і ў Гомелі

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай Рагашчук павіншаваў з надыходзячым Днём ведаў шматдзетную сям'ю і ўручыў школьнікам заплечнікі з поўным наборам канцылярыі, перадае карэспандэнт БелТА.**



Сям'я Мінчыкаў жыве ў новай трохпакаёўцы ў мікрараёне-новабудоўлі на вуліцы з прыгожай назвай Аранжарэйная. Тут выхоўваюць траіх дзяцей. Яраславу ў студзені споўнілася шэсць гадоў. Заўтра для яго знамянальны дзень — ён стане першакласнікам сярэдняй школы № 12. Яго старэйшы брат Мікіта пойдзе ўжо ў восьмы клас.

Мама, Юлія Васілеўна, цяпер у дэкрэтным водпуску з малой Ксюшай.

Мікалай Рагашчук падарыў маленькай прынцэсе дзіцячы планшэт для малявання. Хлапчукам — патрэбны спартыўны інвентар. Плюс поўны набор неабходных для першакласніка рэчаў і прыладаў.

У размове з журналістамі памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці адзначыў, што акцыя «Збяром партфель першакласніку» — добрая справа, да якой падключаюцца людзі па ўсёй краіне. «Усе разумеюць, як няпроста выхаваць і паставіць на ногі дзяцей, таму і прадпрыемствы, і дзяржорганы прыходзяць у такія сем'і і дораць першакласнікам поўны набор усяго, што неабходна для вучобы ў першым класе. Дапамога і падтрымка — адны з галоўных функцый і роляў нашай сацыяльнай дзяржавы. А гэтыя першаклашкі — наша будучыня».

Афіша

# МУЗЫКА ЗАМЕСТ ДОКТАРА!

## Чым здзівяць у Віцебску аматараў філармоніі?

**Улічваючы, што ў краіне новае свята — Дзень народнага адзінства, — у Віцебскай абласной філармоніі рыхтуюць эстрадны канцэрт «Мы народ». Выканаўцы — салісты і калектывы філармоніі. Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ва ўстанове культуры, артысты пакажуць адлік часу і старонкі новай гісторыі. Канцэртная праграма, якая пачнецца 17 верасня ў сем гадзін вечара, — своеасаблівы экскурс у гісторыю Беларусі, яе велічных храмаў, старажытных замкаў і легенд, знаёмства з традыцыямі і сучаснай культурай нашай краіны.**



Арганныя канцэрты ў Віцебскай абласной філармоніі.

Па добрай традыцыі ў філармоніі шмат канцэртаў арганнай музыкі. Яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю. У прыватнасці, 15 верасня ажно дзве магчымасці паслухаць «караля інструментаў». У шэсць гадзін вечара — выступленне з цыкла лекцый-канцэртаў AD LIBITUM «Феномен арганнай музыкі». Выканаўца — Вераніка Багдановіч-Язвінская. Гэтыя канцэрты — радасныя сустрэчы з выдатнай музыкай. Рэжысёр філармоніі Кацярына Дыбаль раскажа просты мовай аб складаным, расчыніць гледачу дзверы ў свет, дзе арганная музыка творыць цуды. Вядома, што арганнае мастацтва славіцца сваімі даўнімі і самабытнымі традыцыямі. У сем вечара таго ж дня — музычная праграма SEASONS («Часы года»). У праграме — музыка Вівальдзі ды іншых. Акрамя аргана, прагучыць флейта.

А 23 верасня прагучыць рэлакс-праграма праекта «Музыкатэрапія праз класіку» (пачатак а 19 гадзіне). «Музыка прымусіла паглыбіцца ў свае думкі, падумаць пра будучыню і сучаснасць, на хвіліну спыніцца ў часе... Цудоўна! Спрыяльна для здароўя. Вялікі дзякуй артыстам», — пакінулі водгукі пра мінулыя праграмы праекта ўдзячныя слухачы.

На канцэрце можна будзе пачуць вялікі канцэртны арган, гукі якога ва ўсе стагоддзі лічыліся гаючымі для энергетыкі чалавека і з'яўляліся праваднікам «зямля-космас». Таксама можна будзе пачуць вельмі рэдкі аркестравы гонг. Гэтаму незвычайнаму музычнаму інструменту прыпісваюць карысны эфект для цела на клетачным узроўні.

Публіка атрымае магчымасць здзейсніць падарожжа па эпохах: ад загадкавага барока да маляўнічага імпрэсіянізму, паслухаць чароўную музыку самых вядомых кампазітараў усіх часоў — Г. Ф. Гендэля, І. С. Баха, С.В. Рахманінава і іншых. Чароўнае дзейства будзе адбывацца пры свечках, з прыглушаным святлом, а для эстэтычнага задавальнення на вялікім экране можна будзе назіраць цудоўны відэарад з карцінамі Мікеланджэла, Леанарда да Вінчы, Рафаэля, а таксама прыгожыя віды космасу, флоры і фаўны планеты. Слухачам абяцаюць далікатную, кранальную, сагравальную музыку. Цікавым будзе расповед пра ўплыў інструментаў на арганізм і псіхіку чалавека.

Сенсацыяй абяцае стаць канцэрт «Джаз з Новага Арлеана» (26 верасня). У слухачоў з'явіцца ўнікальная магчымасць пачуць музыку сусветнага класа з рэпертуару Луі Армстранга. Выступіць квартэт, лідарам якога з'яўляецца Грэгары Бойд. Гэты вакаліст, як і Луі Армстранг, родам з Новага Арлеана. У творчай скарбонцы Грэгары — аўтарскія хіты, напісаныя ў найлепшых традыцыях афраамерыканскага джаза, фанка, блюза і соўла. Прагучаць і «добрая старая» класіка амерыканскага джаза — знакамітыя хіты Луіс Армстранга, такія як: Hello Dolly, Mack The Knife, You Do not Know What It Means To Miss New Orealns, I Cover The Water Front, Basin Street Blues. Крытыкі пішуць, што канцэрты Грэгары Бойда запамінаюцца надоўга і даюць людзям зарад энергіі на цэлы год.

А 1 кастрычніка, у Міжнародны дзень музыкі, у філармоніі адкрыццё XXXIII сезона. Выступіць аркестр капелы SONORUS.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Вернісажы

# Мастак вядомы і невядомы

## Запрашае выстава акварэльных і пастэльных малюнкаў Гаўрыіла Вашчанкі

**У Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва 25 жніўня адбылося адкрыццё выставы народнага мастака Беларусі Гаўрыіла Вашчанкі. Экспазіцыя «Вобразы. Акварэль. Пастэль» цікавая тым, што прадстаўленыя акварэлі і пастэлі з сямейнай калекцыі раней не былі даступныя шырокаму колу гледачоў. У першую чаргу творчасць Вашчанкі асацыіруецца з манументальнымі, буйнымі работамі. Гэта выстава дазваляе паглядзець на мастака з іншага ракурсу. Яна праходзіць у межах праекта «Класікі — сучаснікі», мэта якога — папулярызацыя айчынных мастакоў. Канстанцін Вашчанка, сын творцы, распавёў «Звяздзе» аб асаблівасцях экспазіцыі:**



— Выстава адметная тым, што тут экспануюцца акварэлі і пастэлі, якія мала хто ўвогуле бачыў. Усе ў большай ступені прызвычаіліся да таго, што Гаўрыіл Харытонавіч пісаў алеем, а тут невялікія памеры работ, выкананыя акварэллю. Гэта карціны з уласнай калекцыі сям'і. З цікавых рэчаў можна адзначыць тое, што ўсё праходзіць у галерэі імя Леаніда Шчамялёва. Яны сябравалі, жылі ў адным доме — вельмі адметна і выдатна, што работы экспануюцца ў галерэі сябра. Такая вось сувязь.

На выставе прадстаўлена 25 акварэляў і 19 пастэляў, напісаных у перыяд з 1990 да 2000 года. Але Канстанцін Вашчанка адзначае, што гэта толькі частка таго, што захоўваецца ў сямейнай калекцыі.

Гаўрыіла Вашчанкі не стала сем гадоў таму. Але з кожным годам вартасць яго твораў толькі ўзрастае. У яго работах часта сустракаюцца дэталі-сімвалы, характэрныя для беларусаў: хлеб, буслы, Палессе. Блізкая мастаку і гістарычная тэма — Вашчанка адлюстроўваў Вялікую Айчынную вайну, трагедыю Чарнобыля. Героямі яго работ станавіліся Леў Сапега, Канстанцін Астрожскі, Усяслаў Чарадзей. Тым больш незвычайнай падаецца выстава «Вобразы. Акварэль. Пастэль», дзе мастак адкрываецца з іншага боку. Але і ў акварэльных малюнках праглядаецца элементы манументалізму. Цікава і тое, што ў гэтых работах аўтар эксперыментуе з фактурамі: у некаторых з работ Вашчанка дадае парафін, соль.

Выстава народнага мастака Беларусі будзе доўжыцца да 26 верасня.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Творцы

# КЕРАМІКА — НА ЗАХАДЗЕ, САЛОМКА — НА ЎСХОДЗЕ

## Да Дня народнага адзінства гродзенскія рукадзельніцы стварылі новы від карты Беларусі

**Задумка ўзнікла ў пачатку года, які быў абвешчаны Годам народнага адзінства. Такім чынам майстры вырашылі зрабіць падарунак гораду. Але да якой даты прымеркаваць? Адказ прыйшоў сам сабой: вядома ж, да 17 верасня — Дня народнага адзінства, які быў зацверджаны Указам Прэзідэнта ў чэрвені.**



У праекце задзейнічана некалькі ўстаноў, кожная зрабіла свой унёсак. Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Гродна пашылі аснову. Майстры Цэнтра рамёстваў «Спадчына» робяць аздабленні. Палатно даволі значных памераў — 2,5 метра на 1,5. Для зручнасці яго вывесілі на сцяну. Так можна добра разгледзець, што гэта карта Беларусі, якая складаецца з рознакаляровых абласцей.

Як расказала **загадчыца аддзялення дзённага наведвання для сталых людзей Цэнтра сацабслугоўвання Ленінскага раёна Наталля ГАЛАУЗАВА**, работа над асновай ішла з красавіка да жніўня. Жанчыны падбіралі тканіну, абмяркоўвалі колер кожнага рэгіёна, шылі, рабілі акантоўку. Усе ўносілі свае ідэі і працавалі з вялікім захапленнем.

Нядаўна незвычайная карта краіны была перададзена ў цэнтр рамёстваў «Спадчына». Па словах **загадчыцы цэнтра Марыны ЧЫКУН**, прафесійныя майстры зоймуцца яе дэталёвым аздабленнем. Ужо замацаваны льняныя стужкі з вышыўкай-арнаментам, невялікія вырабы з традыцыйных беларускіх матэрыялаў, карткі з назвамі брэндавых рамесных фестываляў.

— Мы хочам паказаць гарады Беларусі, дзе праходзяць розныя фестывалі і кірмашы з удзелам майстроў народнай творчасці. Гэта своеасаблівая карта брэндавых свят. Напрыклад, у Гродне — Фестываль нацыянальных культур, у Зэльве — «Ганненскі кірмаш». Сёлета на ім была прадстаўлена вялікая калекцыя саламяных вырабаў. А вось свята «Кераміка Крэва» скіравана на ганчарнае рамяство. «Славянскі базар» у Віцебску наогул прадстаўляе шырокі спектр народных рамёстваў. На фестывалі «Наш Грунвальд», які праходзіць у Дудутках Мінскай вобласці, пануюць кавалі, там можна ўбачыць рыцарскія вырабы, рыцарскія даспехі. Аналагічны гэтаму фестываль «Ружанская брама» праходзіць у Брэсце. На свяце «Аляксадрыя збірае сяброў» у Магілёўскай вобласці сёлета былі кірункі — вышыўка, ткацтва, рушнікі. Майстры з усёй краіны прадстаўлялі гэты від традыцыйнага рамяства. Есць свята льну — «Ільняная карусель», — расказала аб некаторых адрасах унікальнай карты Марына Чыкун.

Усе рамёствы будуць пазначаны на карце ў мініяцюры. Штосьці ўжо знайшло сваё месца. Напрыклад, ткацкія палоскі-абярэгі з беларускімі сімваламі. Іх робіць кіраўнік студыі ткацтва Алена Кандрацьева.

— Мая задача — паказаць розныя віды ткацтва. Узоры сімвалізуюць яднанне чалавека з прыродай — сонца, лісты папаратніка, ружа, берагіня, поле, каласы... Чалавек закладваў навакольны свет у сімволіку абярэгаў. Склалася і пэўная колеравая гама. У беларусаў былі папулярныя белены лён, чырвоны і чорны колеры, — патлумачыла майстрыха.

У выніку дапрацоўкі палатно набудзе больш яркі і маляўнічы выгляд, паведамілі ў цэнтры «Спадчына». Будуць створаны гіпсавыя лагатыпы свят, вакол размесцяцца міні-вырабы народных промыслаў. Напрыклад, саламяная зорка, рушнічок з хлебам, керамічная талерка і многае іншае. У Беларусі вельмі шмат брэндавых мерапрыемстваў, якія прэзентуюць рамесную дзейнасць.

Палатно робіцца з такім разлікам, што будзе папаўняцца і набываць новыя адрасы. Яно нясе і інфармацыйную функцыю, бо многія змогуць даведацца, дзе праходзяць фестывалі, і паўдзельнічаць у майстар-класах. Такіх аматараў цяпер нямала, кажа Марына Чыкун. Аб гэтым сведчыць і работа самога цэнтра рамёстваў. Тут працуюць гурткі па саломапляценні, вязанні, ткацтве, кераміцы, валенні шэрсці.

Ідэя праекта — паказаць багаты патэнцыял рамяства Беларусі на сучасным этапе. Па словах ініцыятараў, палатно стане падарункам гораду да Дня народнага адзінства. Яго прэзентацыя адбудзецца падчас урачыстасцяў у абласной філармоніі ў Гродне 17 верасня.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

## Дызайнер і мастачка Алёна ВІТКО:

# «НЕ САРОМЕЙЦЕСЯ НАСІЦЬ КАПЯЛЮШ!»



**Каб мець свой асабісты стыль, неабавязкова набываць рэчы знакамітых замежных брэндаў. Індывідуальнасці вашаму вобразу можа надаць эксклюзіўны капялюш ад айчыннага майстра. Дызайнер і мастачка з Гродна Алёна ВІТКО падзялілася сакрэтамі стварэння галаўных убораў, а таксама расказала, чаму важна мець гэты нязвыклы аксесуар у сваім гардэробе.**

### З ЧАГО ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ...

Па адукацыі мая гераіня — прафесійная мастачка, скончыла педагагічны ўніверсітэт з чырвоным дыпломам. У яе жыцці творчасць была заўсёды, нават калі выйшла замуж і нарадзіла траіх дзяцей, не пакідала захапленняў. Аднойчы яна спаткала сяброўку з Вільнюса ў валеным шаліку (як кажа Алёна, важныя сустрэчы — заўсёды выпадковыя). Ніколі ў жыцці ёй не даводзілася бачыць такой дзіўнай тканіны, выробленай з натуральнай воўны. Захапілася, паглядзела майстар-класы ў інтэрнэце, накупіла матэрыялу і пачала практыкавацца. Аказалася, што ў тэхніцы валення можна ствараць і адзенне, і капялюшыкі, і розныя аксесуары. Гэта дало пэўны штуршок у творчым развіцці майстрыхі, бо яна зразумела: яе магчымасці як мастачкі бязмежныя.

### УСЯ СПРАВА Ў КАПЕЛЮШЫ

— Маё захапленне і талент перадаліся мне ад маёй бабулі, якая ў 1950-х сама шыла капелюшы, сама крухмаліла іх, — карацей, была першая модніца на Данбаскіх шахтах, — пачала Алёна. — Я любіла капелюшы з юнацтва, упрыгожвала іх цікавымі гузікамі, незвычайнымі спражкамі — заўсёды хацела вылучыцца з натоўпу. І раю: не саромейцеся насіць капялюш! Гэта такі аксесуар, які ёсць далёка не ва ўсіх, і шкада, бо ён надае вобразу завершанасць. Таму ў пэўны час усё супала — і захапленне воўнай, і любоў да галаўных убораў.

Па словах Алёны, работа з воўнай і лямцам — гэта працаёмкі працэс, а ёй хацелася, каб капелюшоў было шмат. Мадэльер заўважыла, што яе дызайн цікавы людзям, капелюшы карыстаюцца попытам. Спачатку Алёна працавала як рамесніца, а з 2017 года пачала супрацоўнічаць са знакамітай крамай беларускага адзення «Элема», дзякуючы якой мастачка-ўніверсал выйшла на рэспубліканскі ўзровень.

— Цяпер гэта не проста творчасць, а ўжо бізнес. Насамрэч, капелюшы — не піражкі, для іх не патрэбныя гарачы цэх і вялікая колькасць людзей. Дастаткова мець два чалавекі, — дзеліцца Алёна.

### «МАЯ МАЙСТЭРНЯ — ГЭТА СПАЛЬНЯ І БАЛКОН»

Паступова дызайнер перайшла ад тэхнікі валення да стварэння капелюшоў з фетру, які вельмі падобны да лямцу. У яе калекцыі ёсць шытыя капялюшыкі на кожны дзень — з тканіны, драпавыя, палітовыя, джынсавыя. Алёніна вытворчасць існуе ў хатніх умовах, разгарнуўшыся літаральна, як яна сама кажа, на каленках.

— Мая майстэрня — гэта мае спальня і балкон. Шмат месца не трэба, — дзеліцца майстрыха. — Аб'ёмы ў нас невялікія, аднак, тым не менш, мы можам ахапіць усю краіну, — тлумачыць суразмоўніца.

Рамесніца дзякуе Богу, што, нягледзячы на каранавірусныя катаклізмы і іншае, попыт на яе вырабы ёсць. Яна ўпэўненая — не перавялася яшчэ модніцы. Многія пакупнікі знаходзяць Алёну ў Instagram, дзякуючы і высылаюць фота ў эксклюзіўных галаўных уборах яе дызайну. Майстрыха расказвае, што нядаўна ёй пісала адна пакупніца, якой ніяк не ўдавалася падабраць сабе капялюш. А калі ўбачыла ў краме Алёніны творы, то за тры хвіліны вызначылася з пакупкай.

### ТЭХНАЛОГІЯ СТАРАЯ, ЯК СВЕТ

Алёна расказвае, што на працягу многіх стагоддзяў тэхналогія не змянялася. Усе галаўныя ўборы робяцца з дапамогай капялюшнага каўпака. Аснова можа быць фетравая, саламяная, сшытая з тасьмы. Загатоўка нагадвае шапку для лазні. Пасля выраб намочваецца ці вытрымліваецца ў цёплай альбо гарачай вадзе. Будучы капялюш нацягваецца на лакіраваную драўляную аснову.

**Многія пакупнікі знаходзяць Алёну ў Instagram, дзякуюць і высылаюць фота ў эксклюзіўных галаўных уборах яе дызайну.**

— Калі гэта просты капялюш, то з дапамогай праса ён адпраўляецца. Калі ж гэта больш складаная мадэль, кепка ці берэт, дзе патрэбна краі загнуць унутр, то выкарыстоўваюцца цвікі, сашчэпкі, кнопкі. Усё ўручную. А пасля, калі выраб падсох, падшываем на машынцы гумку, падкладку ва ўнутраную частку, — расказвае Алёна. — Для дэкору часта выкарыстоўваю брошкі з натуральнай скуры ўласнай вытворчасці. Перад тым як галаўны ўбор адправіцца ў краму, наклейваюцца бірка і лагатып, — тлумачыць яна.

«Алёна Вітко» — гэта пазнавальны беларускі брэнд. Мастачка стараецца, каб капялюшыкі былі індывідуальныя, калі форма яшчэ можа быць аднатыпная, то дэкор майстрыха прыдумвае розны, — маўляў, каб не было двух «братоўблізнят».

### НАТХНЕННЕ, ПРЫЗНАННЕ І ГУМАННЫ ЦЭННІК

— Калі неабходна зрабіць капялюш, сядаеш і робіш, і натхненне не прыходзіць. Іншым разам ідзеш у краму, убачу стужачку — і ўжо малюецца вобраз... Я бачу форму, разумею, як усё яно павінна выглядаць — гарманічна, немудрагеліста, з густам.

**Насамрэч, капелюшы — не піражкі, для іх не патрэбныя гарачы цэх і вялікая колькасць людзей.**

З калекцыяй «Валеныя надзеі» мастачка некалькі разоў удзельнічала ў Grodno fashion show. Яна прадстаўляла вырабы з воўны — паліто, капелюшы, сумкі. Алёна заўсёды адкрытая да супрацоўніцтва, з задавальненнем удзельнічае ў розных культурных мерапрыемствах горада, папулярызуе культуру нашэння галаўных убораў. Яна лічыць, што вельмі важна, каб гэты аксесуар мог сабе дазволіць любы сярэднестатыстычны пакупнік. Цэннік рамесніца не завышае, гаворыць, што ён гуманны — не хоча абмяжоўваць кола прыхільнікаў свайго таленту.

### «ХТО НЕ НОСІЦЬ ГАЛАЎНЫ ЎБОР, МНОГАЕ ГУБЛЯЕ»

— Я не лічу, колькі іх у мяне. Калі шыю калекцыю для крамы, абавязкова пакідаю нешта сабе. Вельмі важна падабраць тое, што будзе пасаваць. Я асабіста люблю шырокаполыя капелюшы, фасоны з мужчынскім верхам. Ёсць мадэлі, якія не падабаюцца, бо яны не дужа мне пасуюць. Цяпер вельмі актуальныя панамы, мы іх паставілі ў краму.

Мая гераіня мяркуе: той, хто не носіць галаўны ўбор, многае губляе.

— На твой знешні выгляд могуць не звярнуць увагу, а калі б ты быў у капелюшы — іншая справа! Плюс камфортна сябе адчуваеш, — гаворыць мадэльер. — Мне неяк напісаў у інтэрнэце мужчына, маўляў, а каму ўвогуле патрэбныя вашы капелюшы! (*смяецца*). Я кажу, што капялюш — гэта не толькі знешні выгляд, гэта яшчэ і камфорт, і засцярога ад розных умоў надвор'я, і нават, калі хочаце, твая палачка-выручалачка, напрыклад, калі трэба схаваць недагледжаныя валасы, — расказвае Алёна.

У будучым мадэльер хоча надаць больш разнастайнасці брэнду. Марыць, каб адрадзілася культура нашэння галаўных убораў. Грандыёзных планаў не будуе і не плануе быць каралевай моды. Алёна называе сябе не кар'ерысткай, а працаўніцай.

— Мне падабаецца, калі звычайныя людзі, якія любяць прыгожа апранацца, носяць мае капелюшы. Хачу, каб як мага больш людзей мільгала ў галаўных уборах і радавалася жыццю ў яго шматсядзённасці.

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

### ПАРАДА ПА ДОГЛЯДЗЕ ЗА КАПЕЛЮШОМ

**Да галаўнога ўбору трэба ставіцца беражліва. Для захоўвання неабавязкова выкарыстоўваць адмысловыя каробкі. У Алёны капелюшы размяшчаюцца адзін на адным на паліцы. Пры перавозцы ў чамадане дастаткова пакласці ўнутр што-небудзь мяккае — майку ці ручнік, напрыклад, а палі расправіць. Калі капялюш папсаваўся, неабходна звярнуцца да майстра.**









Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Червенский лесхоз», 223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл., +3751714 52384** |

**Предмет аукциона: ТРАНСПОРТНЫЕ СРЕДСТВА, СПЕЦТЕХНИКА, БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ**
**Месторасположение: Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье»**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01154141 | **Легковой специальный джип CHEVROLE NIVA 212300, рег. знак 8039 IM -5, 2008 г. в.** | 3 758,58 |
| 2 | 01155065 | **Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ 396295-336 (рег. знак АК 3394-5, 2010 г. в.)** | 2 754,68 |

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 1 опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 02.06.2021 г., в газете «Звязда» от 02.06.2021 г., по лоту № 2 – на сайте Государственного комитета по имуществу от 15.04.2021 г., в газете «Звязда» от 15.04.2021 г.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка по **14.09.2021 г.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

**Дата и время проведения аукциона: 16.09.2021** в 11.00 по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье».
**Дата и время окончания приема документов: 14.09.2021** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор аукциона)
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»** (Продавец)

**Лот № 1, состав:** административное здание с инв. № 630/С-47149, 647,0 кв. м. 2. Склад материальный с инв. № 630/С-47154, 397,2 кв. м. 3. Склад для горюче-смазочных материалов с инв. № 630/С-47152, 222,7 кв. м. 4. Боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений с инв. № 630/С-47155, 743,1 кв. м. 5. Ремонтные мастерские с инв. № 630/С-47160, 1960,9 кв. м. 6. Пристройка к реммастерским с инв. № 630/С-47158, 1360,7 кв. м. 7. Боксы для автомашин с инв. № 630/С-47156, 1123,1 кв. м. 8. Навес под баллоны с инв. № 630/С-55558, 35,0 кв. м. 9. Ограждение с инв. № 630/С-55622. 10. Ограждение с инв. № 630/С-55620. 11. Ограждение с инв. № 630/С-55611. 12. Ограждение с инв. № 630/С-55610. 13. Площадка с инв. № 630/С-55608, 7260,0 кв. м. 14. Площадка с инв. № 630/С-55607, 465,0 кв. м. 15. Оборудование котельной, инв. № 146.
**Адрес:** Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33.
**Начальная цена с НДС** – 1 818 216,00 руб.
**Задаток** – 180 000,00 руб. **Штраф** – 50 000,00 руб.
Земельный участок с кадастровым номером 642000000002000230 площадью 1,3310 га.
Право постоянного пользования.
Аукцион состоится **16.09.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **14.09.2021 в 11.00**.
Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.06.2021 № 116.
**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О СНЯТИИ С ТОРГОВ назначенных на 15.09.2021 г.**

**ЛОТ 8: котел отопительный Buderus (котел отопительный служит для нагрева воды в системе отопления и автоматического поддержания заданной температуры. Топливом служит дизельное топливо. Год выпуска – 2004).**
